ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 77 (1611) | Пятніца, 29 верасня 1961 года | Цана 4 кап.

Вышэйшая мэта партыі — пабудаваць камуністычнае грамадства, на сцягу якога напісана: «Ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па патрэбнасцях». У поўнай меры ажыццявіцца лозунг партыі: «Усё ў імя чалавека, для шчасця чалавека».

З ПРАЕКТА ПРАГРАМЫ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

# XXV З'ЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

## САСТАЎ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПБ, выбранага XXV з'ездам КП Беларусі

### Члены ЦК КПБ

АБАКУНЧЫК І. В.
АБУХАЎ Б. У.
АРЛОЎСКІ К. П.
АЎХІМОВІЧ М. Я.
АКСЁНАЎ А. Н.
АНДРЭЕНКА М. А.
АФАНАСЬЕЎ П. В.
АХЛОПКАЎ Л. І.
БАГРОЎ І. Д.
БАРАНАЎ Ф. А.
БАРДЗІЛЁЎ А. Я.
БАРЫСАЎ П. Ф.
БЕЛАГУБ І. А.
БОНДАР А. Г.
БОНДАР В. А.
БРОЎКА П. У.
БУРДЗЕЙНЫ А. С.
ВАРАНЦОЎ А. І.
ВІТАШКЕВІЧ А. М.
ВЯРЖБІЦКАЯ Г. К.
ГАРАЧКІН А. В.
ГАЛУБОВІЧ С. Г.
ГАРБУНОЎ Ц. С.
ГАРКУША І. Ф.
ГАРНАШЭВІЧ Н. П.
ГРЭКАЎ У. А.
ДАРАШЭВІЧ М. В.
ДЗЁМІН І. М.
ЖУДРО Г. Ф.
ЖЫЖАЛЬ І. М.
ЗАГАЕЦКІ М. Ф.
ЗДАРАВЕНІН А. А.
ЗІНКЕВІЧ Р. П.
ЗОЛАЎ А. І.
ІВАНОЎ Ф. М.
ІНСАРАЎ І. А.
КАВАЛЁВА П. Н.
КАЗЛЯКЕВІЧ У. М.
КАЗЛОЎ В. І.
КАЗЛОВА Р. Я.
КАЛОШЫН А. П.
КАМЕНСКІ У. Г.
КАНАНОВІЧ І. С.
КАПІЧ М. Ф.
КАРГІН А. Г.
КАРПАЎ І. Т.
КАЧАН Я. І.
КІЛБАС А. А.
КІСЯЛЁЎ Р. Я.
КІСЯЛЁЎ К. В.
КІСЯЛЁЎ Ц. Я.
КЛІМЕНКА М. А.
КЛІМАЎ І. Ф.
КОЦЯШ Г. І.
КОХАНАЎ П. Л.
КРЫЎЦОЎ Ф. Ф.
КРУКАЎ В. Я.
КРЫЎЛІН Г. А.
КУПР�эВІЧ В. Ф.
КУРКОТКІН С. К.
ЛАБАНОК У. Е.
ЛУЦЭНКА М. М.
ЛУЦКІН В. К.
ЛЯВІЦКІ П. А.
МАЗУРАЎ К. Т.
МАЗУР С. А.
МАКАРАЎ І. М.
МАКСІМАЎ Л. Г.
МАЛІНІН С. М.
МАРТЫСЬ М. А.
МАЦЮШЭЎСКІ К. В.
МАЦАПУРА М. Я.
МАЛОЧКА М. П.
МАШЭРАЎ П. М.
МЕЛЬНІКАЎ М. С.
МЯШКОЎ М. М.
МІКУЛІЧ У. А.
МІКУЛОВІЧ І. Ф.
МІЦКЕВІЧ У. Ф.
НАСІЛОЎСКІ А. Б.
НЕСЦЕРАВА Е. П.
НЕСЦЯРОВІЧ В. П.
ПАЛЬГУЕЎ Ф. М.
ПАЛЯКОЎ І. Я.
ПАНАМАРОЎ Р. Р.
ПАРЭМСКІ Б. Д.
ПІЛАТОВІЧ С. А.
ПРЫТЫЦКІ С. О.
ПРЫХОДЧАНКА У. В.
ПЫЖКОЎ В. А.
ПЯНЬКОЎСКІ В. А.
ПЯТРОЎ В. І.
РАМАНАЎ В. Р.
РУБІС П. Я.
РЫКАЧОЎ Ю. Б.
САРДАРАЎ С. А.
СЕМЯНІХІН Г. У.
СЕЎЧАНКА А. Н.
СІВАК Б. Г.
СІНІЦЫН В. М.
СКАРАПАНАЎ С. Г.
СМІРНОЎ А. А.
СУРГАНАЎ Ф. А.
СЦЕПАНЮК А. К.
ТАРАСАЎ А. М.
ТАРАСАЎ М. П.
ТОЎСЦІК М. А.
ТРУНОЎ У. Б.
УЛАДЗІМІРАВА Л. М.
ФАМІЧОЎ М. Г.
ФІЛІМОНАЎ Д. Ф.
ХАЛІПАЎ М. А.
ХРУСТАЛЁЎ М. В.
ЦЫБУЛЬСКАЯ Т. А.
ЦЯБУТ Д. В.
ЧАРВАНЁЎ Д. Л.
ШАБАШАЎ С. М.
ШАВЯКОЎ Р. І.
ШАРАПАЎ В. І.
ШАУРА В. Ф.
ШАЎРОЎ А. С.
ШАЎЧЭНКА А. І.
ЮЖЫК М. В.
ЯЗЫКОВІЧ В. Ф.
ЯКАЎЛЕВІЧ П. Р.

### Кандыдаты ў члены ЦК КПБ

АБУХОВІЧ А. П.
АСАЕВІЧ Я. А.
БАТУРЫН С. С.
БАТУРЭВІЧ М. Ф.
БАУРЫН В. І.
ВІНАКУРАЎ Ф. П.
ГАРАНІН А. І.
ГЕРАСІМАВА К. Я.
ГІЛЕЎСКАЯ М. М.
ДОРКІН В. Р.
ДЗЯЛЕЦ М. І.
ДЗЕНІСЕВІЧ А. Ю.
ЖЫВАТКОЎ І. М.
КАЗЛОЎ І. К.
КАЛІТКА А. Я.
КАРАЛЁЎ Р. Я.
КАРОЛЬ У. А.
КАШЧЭЕЎ М. В.
КІЙКОЎ А. Я.
КІШКІН С. М.
КРАСНОВА Н. Г.
КРЫШТАЛЕВІЧ У. Ф.
КТАТАРАЎ А. А.
КУЛАГІН М. К.
КУПЧЭНЯ М. В.
КУРЧЫНА Л. М.
ЛІВЕНЦАЎ В. І.
МАУРЫНА Я. А.
МАШКОЎ Г. М.
МІСУНОЎ С. М.
НІКІФАРЭНКА Д. Л.
НІЧЫПАР А. Ф.
ПАГОДЗІНА Н. М.
ПАЎЛЁНАК Б. У.
ПОБАЛЬ А. К.
ПОЛАЗАЎ М. Н.
ПУЦІЛЕЎ С. М.
РАДЗЬКОВІЧ А. Г.
РАЗУМЕНКА А. В.
РАМАНЕНКА З. І.
РАХАНАЎ А. Я.
РУБАХАВА З. Ц.
САВЕЛЬЕЎ А. А.
СВІРЫДА В. Р.
СКУРКО Я. І. (Максім Танк)
СМІРНОЎ К. В.
СНЯЖКОВА Н. Л.
ТУРАВЕЦ Д. М.
ФАДЗЕЕЎ А. Г.
ФІЛІПАЎ Г. А.
ЧАЙКА Я. М.
ЧАРНУШЧАНКА Г. Г.
ШВАРЦБУРГ П. І.
ШУМІЛІН Б. Ц.
ШЧЫТНІКАЎ П. І.
ЯРМОЛЕНКА М. Ф.

## САСТАЎ РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ КПБ, выбранай XXV з'ездам КП Беларусі

АДАМОВІЧ П. С.
АНДРЭЙЧАНКА С. Д.
АСЮКОЎ Р. Л.
АЎЧАРЭНКА І. М.
БАЗАЕЎ А. Г.
БАУМ У. А.
ВАСІЛЬЧУК І. М.
ЖАЛЕЗНЯКОВІЧ П. А.
ЖУКОЎСКІ М. М.
ЗАЛЕСКІ А. М.
ЗАНЕЎСКАЯ М. В.
КІЖАНЦАЎ М. А.
КЛЮЧАНКОЎ І. Н.
КЛЯПАЦКАЯ Н. А.
КОЖАР І. П.
ЛУКАШЭВІЧ Д. А.
ЛУПІНОВІЧ І. С.
МАРОЗ І. М.
МАХНАЧ А. С.
МАЦЮШКА В. Ф.
ПАПОЎ А. М.
ПІРОГ В. М.
РАЙ С. С.
РУДАК А. Д.
САБЕЛЬНІКАЎ М. І.
СЯДЫХ В. Я.
СЯРКОВА К. К.
ФАДЗЕЕЎ Ф. Р.
ФЯСЬКО В. І.
ХАДАКОЎСКІ А. А.
ЦІХАНЕНКА Я. С.
ЧЫЖОЎ А. А.
ШАРДЫКА С. Ц.
ШЫНКАРОВА Ю. Н.
ЯКАВЕНКА У. К.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ аб пленуме ЦК КП Беларусі

**28 верасня г. г. адбыўся першы арганізацыйны пленум Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі, выбранага XXV з'ездам КПБ.**

**Пленум выбраў Бюро Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі ў саставе наступных таварышаў:**

### Члены Бюро ЦК КПБ

**ЗОЛАЎ А. І., КІСЯЛЁЎ Ц. Я., КЛІМАЎ І. Ф., КАЗЛОЎ В. І., МАЗУРАЎ К. Т., МАКАРАЎ І. М., МАШЭРАЎ П. М., ПРЫТЫЦКІ С. О., СУРГАНАЎ Ф. А., ФІЛІМОНАЎ Д. Ф., ШАУРА В. Ф.**

### Кандыдаты ў члены Бюро ЦК КПБ

**МАКСІМАЎ Л. Г., ПЯНЬКОЎСКІ В. А., ПІЛАТОВІЧ С. А.**

**Пленум стварыў Сакратарыят ЦК КПБ. Першым сакратаром ЦК КПБ выбран тав. МАЗУРАЎ К. Т., другім сакратаром выбран тав. СУРГАНАЎ Ф. А., сакратарамі ЦК КПБ выбраны т. т. МАШЭРАЎ П. М., ШАУРА В. Ф. і ФІЛІМОНАЎ Д. Ф.**

**Пленум зацвердзіў загадчыкаў аддзелаў ЦК КПБ, рэдактараў часопіса «Камуніст Беларусі», газет «Звязда», «Советская Белоруссия» і «Калгасная праўда».**

## У Рэвізійнай камісіі КП Беларусі

**28 верасня адбылося пасяджэнне Рэвізійнай камісіі КП Беларусі. Старшынёй Рэвізійнай камісіі выбран тав. СЯДЫХ В. Я.**

## Дзённік пасяджэнняў

26 верасня ў Мінску адкрыўся XXV з'езд Камуністычнай партыі Беларусі.

Залу Акруговага Дома афіцэраў запоўнілі дэлегаты з'езда, якія прыбылі з усіх кашчоў рэспублікі. Сярод іх старыя бальшавікі — удзельнікі трох рэвалюцый, кіраўнікі партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў, старшыні калгасаў, вучоныя, наватары прамысловасці, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі.

У зале прысутнічаюць таксама шматлікія госці.

10 гадзін раніцы. Кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ тав. К. Т. Мазураў аб'яўляе XXV з'езд Камуністычнай партыі Беларусі адкрытым. У зале раздаюцца працяглыя апладысменты.

З'езд пераходзіць да фарміравання сваіх кіруючых органаў.

Па даручэнню дэлегацый Гомельскай, Брэсцкай і Мінскай абласцей сакратар Гомельскага абкома КПБ тав. І. Я. Палякоў прапануе выбраць прэзідыум з'езда ў складзе 39 чалавек. Гэта прапанова прымаецца, з'езд аднагалосна выбірае прэзідыум.

Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты ў ганаровы прэзідыум з'езда выбіраецца Прэзідыум ЦК КПСС на чале з выдатным ленінцам таварышам Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым.

Па даручэнню дэлегацый Гродзенскай і Віцебскай абласцей сакратар Віцебскага абкома КПБ тав. В. А. Бондар уносіць прапанову выбраць сакратарыят з'езда. Сакратарыят выбіраецца аднагалосна ў складзе 21 чалавека.

Па даручэнню дэлегацый Магілёўскай і Мінскай абласцей сакратар Магілёўскага абкома КПБ тав. Н. Л. Сняжкова ўносіць прапанову выбраць мандатную камісію ў складзе 27 чалавек. З'езд аднагалосна выбірае мандатную камісію.

Па даручэнню дэлегацый Гродзенскай і Гомельскай абласцей сакратар Гродзенскага абкома КПБ тав. І. Ф. Мікуловіч прапануе выбраць рэдакцыйную камісію з'езда ў складзе 27 чалавек. Рэдакцыйная камісія выбіраецца аднагалосна.

Далей з'езд зацвярджае парадак дня і рэгламент з'езда.

**ПАРАДАК ДНЯ**

1. Аб праекце Праграмы КПСС.
2. Аб праекце Статута КПСС.
3. Справаздача аб рабоце Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі.
4. Справаздача аб рабоце Рэвізійнай Камісіі КП Беларусі.
5. Выбары кіруючых органаў КП Беларусі.

З дакладам аб праекце Праграмы КПСС выступіў другі сакратар ЦК КП Беларусі тав. Ф. А. Сурганаў.

У спрэчках па дакладу аб праекце Праграмы КПСС выступілі першы сакратар Мінскага абкома КПБ тав. С. О. Прытыцкі, першы сакратар Гродзенскага абкома КПБ тав. Р. Р. Панамароў, старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР тав. П. У. Броўка, зборшчык Мінскага аўтамабільнага завода тав. У. В. Прыходчанка, сакратар Гомельскага абкома КПБ тав. А. І. Варанцоў, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР тав. В. І. Казлоў.

На ранішнім пасяджэнні з'езд заслухаў таксама даклад старшыні мандатнай камісіі тав. В. Ф. Языковіча.

— XXV з'езду КП Беларусі,— гаворыць ён,— папярэднічалі справаздачна-выбарныя сходы ў первічных партыйных арганізацыях, раённыя, гарадскія і абласныя партыйныя канферэнцыі. Справаздачы і выбары ў партыйных арганізацыях прайшлі пры высокай актыўнасці камуністаў, пад знакам далейшага развіцця ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, праверкі дзейнасці партыйных камітэтаў па выкананню рашэнняў партыі і ўрада. Справаздачы і выбары паказалі непрымірымасць камуністаў да недахопаў у рабоце, прадэманстравалі адзінства і згуртаванасць партыйнай арганізацыі рэспублікі вакол ленінскага Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Усяго на XXV з'езд Кампартыі Беларусі выбрана 772 дэлегаты, у тым ліку 675 дэлегатаў з правам рашаючага голасу і 97 з правам дарадчага голасу.

Мандатная камісія праверыла паўнамоцтвы ўсіх дэлегатаў XXV з'езда КПБ і ўстанавіла, што выбары дэлегатаў па абласных партыйных канферэнцыях праведзены закрытым (тайным) галасаваннем у строгай адпаведнасці з патрабаваннямі Статута партыі, інструкцыі ЦК КПСС аб выбарах кіруючых партыйных органаў і пастановы VI пленума ЦК КПБ аб скліканні XXV з'езда КП Беларусі.

Усе дэлегаты, выбраныя на з'езд, атрымалі неабходную большасць галасоў. Камісія прызнала паўнамоцтвы ўсіх прысутных на з'ездзе дэлегатаў сапраўднымі.

— Партыя, — гаворыць тав. Языковіч, — праводзіць велізарную работу па выхаванню і падрыхтоўцы свядомых і высокакваліфікаваных людзей. У рады партыі прыходзіць выдатнае папаўненне, якое мае высокую агульнаадукацыйную і спецыяльную падрыхтоўку. Усе камуністы лічаць сваім найпершым абавязкам няспынна павышаць свой палітычны, агульнаадукацыйны і прафесіянальны ўзровень. Аб гэтым сведчыць і склад дэлегатаў з'езда. 84,7 працэнта дэлегатаў маюць вышэйшую, незакончаную вышэйшую і сярэднюю адукацыю.

На XXV з'езд КПБ выбрана 144 перадавікі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Многія з іх удастоены гачаровага звання ўдарнікаў камуністычнай працы.

448 дэлегатаў з'езда з'яўляюцца ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку 132 — удзельнікамі партызанскага руху ў тыле нямецкіх захопнікаў. 505 дэлегатаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, 36 носяць высокае званне Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы. Сярод дэлегатаў 152 дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета БССР.

На XXV з'езд выбрана 159 жанчын — звыш 20 працэнтаў агульнай колькасці дэлегатаў. Гэта значна больш, чым выбіралася на папярэднія з'езды.

Рыхтуючыся да XXII з'езда КПСС, гаворыць у заключэнне дакладчык, працоўныя гарадоў і сёл Беларусі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі натхнёна і плённа працуюць над выкананнем задач сямігадовага плана. Яшчэ больш іх натхняюць велічныя перспектывы, якія адкрывае перад краінай праект новай Праграмы КПСС. Няма сумнення, што камуністы рэспублікі, як і ўвесь савецкі народ, аддадуць свае сілы вялікай справе будаўніцтва камунізма ў нашай краіне.

З'езд аднагалосна зацвердзіў даклад мандатнай камісіі.

На вячэрнім пасяджэнні працягвалася абмеркаванне даклада аб праекце Праграмы КПСС. У спрэчках выступілі: камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі тав. В. А. Пянькоўскі, старшыня выканкома Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў працоўных тав. В. К. Луцкін, сакратар ЦК КПБ тав. В. Ф. Шаура, міністр культуры БССР тав. Р. Я. Кісялёў, прэзідэнт Акадэміі навук БССР тав. В. Ф. Купрэвіч, свінарка калгаса імя Чапаева Уваравіцкага раёна тав. Н. Н. Пагодзіна і старшыня выканкома Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных тав. П. А. Лявіцкі.

Дэлегаты з'езда аднагалосна прымаюць рэзалюцыю па дакладу тав. Ф. А. Сурганава аб праекце Праграмы КПСС.

Затым з'езд пераходзіць да абмеркавання другога пункту парадку дня з'езда. З дакладам аб праекце Статута КПСС выступіў сакратар ЦК КПБ тав. П. М. Машэраў.

У спрэчках па дакладу тав. П. М. Машэрава выступілі першы сакратар Віцебскага абкома КПБ тав. У. Е. Лабанок, сакратар Мінскага абкома КПБ тав. М. І. Лагір.

Пад працяглыя апладысменты дэлегаты з'езда прынялі прывітальныя тэлеграмы з'ездам Камуністычнай партыі Латвіі і Камуністычнай партыі Узбекістана.

27 верасня на XXV з'ездзе Камуністычнай партыі Беларусі працягвалася абмеркаванне даклада сакратара ЦК КПБ тав. П. М. Машэрава аб праекце Статута КПСС.

У спрэчках па дакладу выступілі сакратар Магілёўскага абкома КПБ тав. Ф. М. Іваноў, сакратар партарганізацыі калгаса імя Леніна Столінскага раёна тав. А. М. Шуплянкова, сакратар Свісланскага РК КПБ тав. М. Б. Сасноўскі, сакратар Веткаўскага РК КПБ тав. І. А. Белагуб, птушніца птушкафабрыкі імя Крупскай тав. Н. П. Гарнашэвіч, рэдактар часопіса «Камуніст Беларусі» тав. Я. І. Качан, сакратар партыйнага камітэта Аршанскага льнокамбіната тав. Н. Н. Смалякова.

Пасля заканчэння спрэчак з'езд аднагалосна прымае рэзалюцыю па дакладу тав. П. М. Машэрава аб праекце Статута КПСС.

Затым з'езд пераходзіць да абмеркавання трэцяга пытання парадку дня. Са справаздачным дакладам аб рабоце Цэнтральнага Камітэта КПБ выступіў першы сакратар ЦК КП Беларусі тав. К. Т. Мазураў.

На ранішнім пасяджэнні з'езд таксама заслухаў справаздачны даклад старшыні Рэвізійнай камісіі КПБ тав. В. Я. Сядых.

На вячэрнім пасяджэнні з'езд пачаў абмеркаванне справаздачных дакладаў Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі і Рэвізійнай камісіі КПБ.

У спрэчках выступілі першы сакратар Гомельскага абкома КПБ тав. І. Я. Палякоў, старшыня Белсаўпрофа тав. І. М. Макараў, першы сакратар Брэсцкага абкома КПБ тав. А. А. Смірноў, старшыня калгаса «Стаханавец» Іўеўскага раёна тав. У. А. Баум, старшыня Саўнаргаса БССР тав. А. М. Тарасаў, сакратар Мінскага гаркома КПБ тав. А. Б. Насілоўскі, міністр унутраных спраў БССР тав. А. Н. Аксёнаў.

На імя XXV з'езда КПБ паступілі прывітальныя тэлеграмы ад з'ездаў Камуністычных партый Казахстана, Узбекістана, Латвіі і Цэнтральных Камітэтаў Камуністычных партый Грузіі, Арменіі, Азербайджана і Кіргізіі. Дэлегаты з'езда сустрэлі прывітанні братніх Кампартый бурнымі апладысментамі.

З вялікім уздымам дэлегаты з'езда прынялі прывітальныя тэлеграмы маскоўскай гарадской партканферэнцыі, з'ездам Камуністычных партый Украіны, Казахстана, Эстоніі, Літвы, Грузіі і Малдавіі.

Ад калектываў прадпрыемстваў, будоўляў, калгасаў і саўгасаў у адрас XXV з'езда КПБ паступілі шматлікія прывітанні і тэлеграмы, у якіх працаўнікі прамысловасці і сельскай гаспадаркі рапартуюць аб вытворчых поспехах і абавязваюцца сустрэць XXII з'езд КПСС новымі працоўнымі перамогамі.

Учора, 28 верасня, на ранішнім пасяджэнні XXV з'езда Камуністычнай партыі Беларусі працягвалася абмеркаванне справаздачнага даклада Цэнтральнага Камітэта КПБ і Рэвізійнай камісіі КПБ.

У спрэчках выступілі сакратар Магілёўскага абкома КПБ тав. К. В. Мацюшэўскі, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Л. Г. Максімаў, сакратар Гродзенскага абкома КПБ тав. І. Ф. Мікуловіч, міністр вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі тав. М. В. Дарашэвіч, старшыня выканкома Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных тав. У. Ф. Міцкевіч, сакратар Віцебскага гаркома КПБ тав. В. М. Сініцын, стругальшчык Мінскага станкабудаўнічага завода імя Варашылава тав. А. С. Высакоўскі, старшыня Савета Міністраў БССР тав. Ц. Я. Кісялёў, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў БССР тав. В. І. Пятроў, дырэктар саўгаса «Стара-Барысаў» тав. Г. К. Вяржбіцкая, міністр будаўніцтва БССР тав. І. М. Жыжаль, дырэктар Мінскага завода аўтаматычных ліній тав. А. П. Кашлын, старшыня выканкома Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных тав. У. Б. Труноў, пракурор БССР тав. А. Г. Бондар, сакратар партыйнага камітэта трактарнага завода тав. М. А. Мартысь, загадчыца навучальнай часткі школы № 21 гор. Мінска тав. Н. М. Патапава, начальнік Беларускай чыгункі тав. Г. І. Коцяш, сакратар Полацкага гаркома КПБ тав. П. Р. Якаўлевіч.

З заключным словам выступіў першы сакратар ЦК КПБ тав. К. Т. Мазураў.

— Аднадушнае адабрэнне праекта Праграмы КПСС і праекта Статута КПСС, — гаворыць тав. Мазураў, — глыбокае, дзелавое абмеркаванне гаспадарчых і палітычных задач, якія стаяць перад рэспублікай і яе Камуністычнай партыяй, сведчыць аб сапраўднай сталасці беларускай партыйнай арганізацыі, яе здольнасці весці за сабой масы, арганізоўваць іх на барацьбу за пабудову камуністычнага грамадства.

Наш з'езд паказаў, што Кампартыя Беларусі з'яўляецца баявым атрадам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, поўнасцю адабрае і падтрымлівае палітыку Цэнтральнага Камітэта КПСС на чале з верным ленінцам таварышам Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым.

Дазвольце ад імя ўсіх дэлегатаў з'езда запэўніць ленінскі Цэнтральны Камітэт нашай партыі ў тым, што камуністы Беларусі будуць і ў далейшым вернай і надзейнай яго апорай, адданымі і непахіснымі барацьбітамі за трыумф камунізма ў нашай краіне.

Пасля заключнага слова тав. К. Т. Мазурава з'езд аднадушна прымае рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу аб рабоце Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі.

З'езд таксама аднагалосна зацвердзіў даклад Рэвізійнай камісіі КПБ.

На імя XXV з'езда КПБ паступілі прывітальныя тэлеграмы ад з'ездаў Камуністычных партый Украіны, Таджыкістана, Малдавіі, Літвы і Эстоніі. Прывітанні братніх кампартый дэлегаты з'езда сустрэлі бурнымі апладысментамі.

З'езд пераходзіць да выбараў Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі і Рэвізійнай камісіі КПБ.

На вячэрнім пасяджэнні былі зачытаны вынікі выбараў Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі і Рэвізійнай камісіі КПБ.

З велізарным натхненнем дэлегаты з'езда прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

XXV з'езд КП Беларусі аб'яўляецца закрытым. Усе ўстаюць і спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал». Чуваць воклічы: «Няхай жыве Камуністычная партыя Савецкага Саюза!», «Няхай жыве ленінскі Цэнтральны Камітэт КПСС на чале з таварышам Хрушчовым!»

Дэлегаты XXV з'езда Кампартыі Беларусі і XXII з'езда КПСС [злева направа]: старшыня Саюза пісьменнікаў БССР Пётр Усцінавіч Броўка; сакратар Карэліцкага райкома партыі Гродзенскай вобласці Павел Арсенавіч Жалезняковіч; свінарка саўгаса «Крынкі» Лёзненскага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы Марыя Якаўлеўна Ігнатава і дырэктар саўгаса «Рось» Ваўкавыскага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы Рыгор Іванавіч Шавякоў.

Фото В. ЛУПЕЙКІ. (БЕЛТА).

## Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла з друку першую частку двухтомнага выдання «Нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі». Кніга падрыхтавана Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

У першай частцы нарысаў — сем раздзелаў. У іх асвятляецца слаўная гісторыя камуністычнай арганізацыі рэспублікі ад пачатку рабочага руху і распаўсюджання марксізма ў Беларусі (1883—1894 гг.) да перыяду завяршэння грамадзянскай вайны, замежнай інтэрвенцыі і ўтварэння Камуністычнай партыі Беларусі (1918—1920 гг.).

# ГЭТЫЯ ПЫТАННІ

## Самадзейнасць? Так. Але НА ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ

За два з лішнім гады ў рэспубліцы з'явілася больш дваццаці народных тэатраў. Гэта наглядное сведчанне шырокага ажыццяўлення ў нашай краіне праграмы эстэтычнага выхавання працоўных, сведчанне таго, якім насычаным і паўнакроўным становіцца духоўнае жыццё нашага народа.

Перспектыўны план развіцця сеткі культурна-асветных устаноў рэспублікі прадугледжвае арганізацыю 80 самадзейных народных тэатраў да канца сямігодкі.

Але ўжо і сёння адкрыццё новых тэатраў стрымлівае адсутнасць добра падрыхтаваных кіраўнікоў — галоўных рэжысёраў, якія змаглі б правільна паставіць творчую і вучэбна-выхаваўчую работу. Гэтае пытанне надзвычай важнае і вырашыць яго трэба неадкладна, інакш ставіцца пад пагрозу стварэнне ў рэспубліцы новых народных тэатраў.

Пры Тэатральна-мастацкім інстытуце ёсць рэжысёрскі факультэт з вельмі абмежаванай колькасцю студэнтаў. На трэцім і чацвёртым курсах займаецца ўсяго па пяць, а на першым і другім курсах па адзінаццаць чалавек. Першы выпуск (пяць чалавек) будзе толькі ў 1963 годзе. Гэтыя студэнты ўжо цяпер сябе добра зарэкамендавалі, і, безумоўна, яны будуць працаваць у прафесіянальных тэатрах. Але ж у 1963 годзе ў рэспубліцы па плану павінна быць 56 народных тэатраў. І ўжо цяпер трэба было б, каб першы і другі курсы рэжысёрскага факультэта рыхтавалі кадры для народных тэатраў, а з наступнага года павялічыць хоць бы ў два разы набор на факультэт.

Але і пры гэтай умове рэжысёрскі факультэт не зможа задаволіць патрэбы самадзейнасці. Прыйдзецца, відаць, шукаць яшчэ нейкія крыніцы. Адной з іх могуць быць курсы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Магчыма, што на іх базе трэба стварыць двухгадовыя пастаянна дзеючыя курсы для падрыхтоўкі рэжысёраў і прымаць туды слухачоў з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй, якія маюць практычны стаж работы кіраўніка драматычнага калектыву.

Так ці інакш, а ў народных тэатрах сёння — самая вострая праблема—праблема рэжысуры. Гледачы хочуць бачыць драматычную самадзейнасць амаль на прафесіянальным узроўні, а гэта могуць забяспечыць прафесіянальна падрыхтаваныя рэжысёры. Яны ж нясуць поўную адказнасць і за вучэбна-выхаваўчую працу.

Не менш важнае значэнне мае і выхаванне ў самадзейных артыстаў адказнасці за сваю працу і нават звычайнай сціпласці. Выканаўцам, якія вызначыліся, прысвойваецца званне «Артыст народнага тэатра». І некаторыя таварышы, атрымаўшы такое высокае званне, пачынаюць зазнавацца, супрацьстаўляюць сябе іншым удзельнікам, патрабуюць матэрыяльнага заахвочвання, без аплаты адмаўляюцца выступаць. Гэта азначае, што ў калектыве дрэнна пастаўлена выхаванне і рэжысёр не змог прышчапіць людзям пачуцця высокай адказнасці і сціпласці.

Агульнавядома, што ў вызначэнні рэпертуарнай лініі народнага тэатра першае слова таксама належыць рэжысёру. Глядач чакае ад народнага тэатра спектакляў, у першую чаргу, на тэмы сучаснага народнага жыцця і шукае ў сваім тэатры, перш за ўсё, адказ на многія вострыя пытанні, якія хвалююць яго іменна сёння. Але ён не заўсёды знаходзіць такія адказы, таму што ставіцца яшчэ многа выпадковых п'ес.

Іншы раз у калектыве ёсць адзін добры выканаўца і рэжысёр дзеля аднаго яго спыняецца на той ці іншай п'есе, якая не пад сілу ўсяму калектыву. А бывае, што рэжысёр бярэ да пастаноўкі п'есу, якая ні для творчага жыцця тэатра, ні для выхавання калектыву не мае асаблівай каштоўнасці. Думаецца, што выбар п'есы «Дрэвы паміраюць стоячы» ў Барысаўскім народным тэатры з гэтага пункту гледжання не зусім прадуманы.

Разам з тым, гледачы чакаюць ад народных тэатраў разнастайнага рэпертуару. Толькі непажадана, каб ён паўтараў многія пастаноўкі прафесіянальных тэатраў. Лепш, калі народныя тэатры будуць узбагачаць свой рэпертуар новымі п'есамі. Тым не менш добра было б, каб хоць адзін спектакль народнага тэатра дубліраваў пастаноўку на прафесіянальнай сцэне. Гэта дасць магчымасць абменьвацца асобнымі выканаўцамі, знаёміцца з рэпетыцыямі, ажыццяўляць кансультацыі і г. д. Калектыў народнага тэатра здолее паехаць на генеральную рэпетыцыю ці спектакль дзяржаўнага тэатра.

Наогул паміж самадзейнымі і прафесіянальнымі тэатрамі павінна быць больш цесная сувязь. Народным тэатрам вялікую дапамогу могуць аказаць і драматургі. Ашмянскі народны тэатр паставіў камедыю А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце». Гэты спектакль нарадзіўся ў цеснай садружнасці з аўтарам. Такая садружнасць пажадана ва ўсіх народных тэатрах. Чаму, скажам, А. Маўзон не можа ўзяць шэфства над Слуцкім народным тэатрам, а І. Шамякін — над Барысаўскім, дзе ставіліся іх п'есы?

Шэфская дапамога прафесіянальных тэатраў самадзейным, якая прадугледжана загадам Міністэрства культуры БССР, пакуль што мала эфектыўная. Шэфства мае на мэце сталую, канкрэтную дапамогу: трэба пасылаць рэжысёраў, мастакоў для пастаноўкі або кансультацыі, каладжваць гастрольныя выступленні асобных артыстаў прафесіянальнага тэатра ў найбольш складаных ролях, рэжысёры і вядучыя акцёры павінны перыядычна праводзіць у народным тэатры лекцыі, гутаркі і вучэбныя заняткі, патрэбна пасылаць спецыялістаў з вытворчых цэхаў тэатра для дапамогі ў працы.

А хіба немагчыма перадаць падшэфнаму тэатру з дазволу Міністэрства культуры сцэнічнае абсталяванне, электраасвятляльную апаратуру, бутафорыю, рэквізіт, касцюмы, афармленне спектакляў? Добрую паслугу зрабілі б прафесіянальныя тэатры, арганізаваўшы пры тэатрах семінары-практыкумы для падрыхтоўкі асвятляльнікаў, грымёраў, бутафораў-рэквізітараў з ліку ўдзельнікаў народных тэатраў. Вялікую карысць дала б стажыроўка пры прафесіянальных тэатрах рэжысёраў або кіраўнікоў драматычных калектываў.

Вось гэта была б дзейсная дапамога. Народны тэатр не можа існаваць і ўдасканальвацца, калі яго калектыў не будзе згуртаваны адзінствам ідэйна-творчых намаганняў, высокай свядомасці і грамадскай дысцыпліны. Кожны ўдзельнік тэатра нясе адказнасць за сваю працу і за выкананне ўстаноўленых правіл перад калектывам, а калектыў нясе маральную адказнасць за кожнага са сваіх членаў.

Усё гэта павінна быць адлюстравана ў статуце народнага тэатра.

Статут павінен вызначыць арганізацыйныя прынцыпы тэатра, фінансавую базу, склад артыстаў, абавязкі і правы агульнага сходу, мастацкага савета і галоўнага рэжысёра.

Большасць народных тэатраў пакуль што статута не мае. Рэспубліканскаму Дому народнай творчасці трэба было б распрацаваць прыкладны статут, які з некаторымі зменамі, улічваючы мясцовую спецыфіку, стаў бы асноўным законам жыцця народных тэатраў.

# НЕ ЦЕРПЯЦЬ АДКЛАДУ

Палажэнне аб народных тэатрах прадугледжана бюро ў складзе 7—9 чалавек, якое ўзначальваецца галоўным рэжысёрам. На ім ляжыць штодзённая дапамога рэжысёру ў арганізацыі дзейнасці тэатра, у падрыхтоўцы рэпетыцый, правядзенні спектакляў і вучэбна-выхаваўчай работы. Бюро не замяняе мастацкі савет, у якога свае функцыі—абмеркаванне рэпертуарных планаў, асобных п'ес, якія прымаюцца да пастаноўкі, прагляд і абмеркаванне падрыхтаваных да выпуску новых пастановак. У большасці тэатраў такіх бюро яшчэ няма.

Для нармальнай працы народных тэатраў перш за ўсё неабходна свая база, дзе можна было б праводзіць рэпетыцыі, вучэбныя заняткі, ставіць спектаклі. Але многія тэатры не маюць такой базы. Як правіла, яны працуюць пры раённых і гарадскіх дамах культуры, якія не хочуць прадастаўляць памяшканне для рэпетыцый і спектакляў, таму што 25—28 дзён у месяц паказваюць кінафільмы. І гэта скоўвае творчы рост драматычных калектываў.

У свой час было вынесена рашэнне аб адкрыцці спецыялізаванага магазіна па продажу неабходных матэрыялаў для калектываў мастацкай самадзейнасці. Аднак рашэнне і да гэтага часу не выканана.

Сакратарыят ВЦСПС прыняў пастанову, якою дадзена права рэспубліканскім і абласным саветам прафсаюзаў прысвойваць званні народных тэатраў лепшым тэатральным калектывам прафсаюзаў. Саветы прафсаюзаў павінны гэта праводзіць у цесным кантакце з рэспубліканскімі і абласнымі дамамі народнай творчасці. Такога кантакту пакуль няма. Хіба нармальна, калі аб прысваенні назвы народнага тэатра драматычнаму калектыву Брэсцкага чыгуначнага клуба амаль на працягу месяца не ведалі ні Міністэрства культуры БССР, ні Рэспубліканскі і абласныя дамы народнай творчасці?

Ёсць рад іншых пытанняў, якія нельга вырашаць без Міністэрства культуры БССР. У прыватнасці — тарыфікацыя галоўнага рэжысёра і загадчыка пастановачнай часткі робіцца адзінай тарыфікацыйнай камісіяй Міністэрства культуры. Пытанні матэрыяльнага забеспячэння тэатраў таксама лягчэй вырашаць разам.

Высакародная дзейнасці народных тэатраў павінны дапамагаць усе ўстановы і арганізацыі, уся наша грамадскасць.

**М. КОЛАС,**
**старшы інспектар Упраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры БССР.**

**Да вынікаў абмеркавання праблем развіцця тэатральнай самадзейнасці ў газеце будзе змешчаны рэдакцыйны артыкул.**

## Беларускія мастакі рапартуюць



К. ТКАЧУК. З серыі «На Палессі».

# ДРУГІ НАВУЧАЛЬНЫ

У Гомельскім Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна пачаліся заняткі другога набора універсітэта мастацкага выхавання.

З нецярплівасцю чакалі гэтага дня рабочыя, служачыя, студэнты. Усе яны добра ведаюць, што «ад культурнага росту насельніцтва ў велізарнай ступені залежыць уздым прадукцыйных сіл, прагрэс тэхнікі і арганізацыя вытворчасці, павышэнне грамадскай актыўнасці працоўных, развіццё дэмакратычных асноў самакіравання, камуністычная перабудова быту». Так запісана ў гістарычным дакументе—праекце Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

На першыя агульнаўніверсітэцкія заняткі прыйшло каля тысячы чалавек. Гэта пераважна моладзь, перадавікі вытворчасці, ударнікі і члены брыгад камуністычнай працы, людзі розных прафесій. Слухачамі універсітэта ўпершыню сталі зменны майстар фабрыкі «Палесдрук» Ала Салдаценка, слесар завода «Гомсельмаш» Віктар Байдарэнка, выхавацельніца дзіцячага сада з прыгараднага рабочага пасёлка Касцюкоўка Галіна Ражыцына, работніцы дрэваапрацоўчага камбіната Юлія Шабаліна і Тамара Ісачэнка і многія іншыя.

У бягучым навучальным годзе універсітэт мастацкага выхавання будзе працаваць па абноўленай праграме. У яе ўключаны тэмы, падказаныя жыццём. Слухачы будуць вывучаць матэрыялы гістарычнага XXII з'езда КПСС, пазнаёмяцца з лепшымі творамі савецкага мастацтва. Будзе праведзена некалькі творчых сустрэч з кампазітарамі, драматургамі, артыстамі, мастакамі.

Вопыт работы універсітэта паказаў, якую вялікую карысць прыносіць прагляд і абмеркаванне спектакляў абласнога тэатра і самадзейных драматычных калектываў. Такія заняткі прадугледжаны праграмай і ў бягучым навучальным годзе.

**Р. ЗАЙЦАЎ.**

# НА ЎСКРАІНЕ—ЯК У ЦЭНТРЫ

## ТАК ПАВІННА БЫЦЬ!

НОВЫ МІКРАРАЁН Мінска. Будаўніцтва яго пачалося ў 1957 годзе. А які ён ужо велізарны!

Вось цэнтральная магістраль раёна — вуліца Карла Лібкнехта. Паабапал яе выстраіліся чатырох- і пяціпавярховыя жылыя дамы, сярэдняя школа. Тут жа размешчана клінічная бальніца, навукова-даследчы інстытут туберкулёзу, дзіцячыя сады і яслі.

Роўнымі радамі стаяць гэтыя высокія прыгажуны з вялікімі вокнамі, балконамі, тэлевізійнымі антэнамі на дахах. Вакол памяшканняў — тратуары пакрыты асфальтам, а побач — маладыя дрэвы, газоны, кветкі.

Вуліца цягнецца ўсё далей і далей. На ёй ёсць некалькі харчовых і прамтаварных магазінаў, атэлье і майстэрні індывідуальнага пашыву адзення, па рамонту электраапаратуры, гадзіннікаў, пункты хімчысткі і пральні, аддзяленне сувязі, аптэка, бібліятэка, дзіцячая паліклініка, цырульня.

А як жа абстаіць справа ў мікрараёне з задавальненнем культурных запатрабаванняў жыхароў?

На ўсёй плошчы вялікай новабудоўлі няма і яе будуецца ні адной культурна-асветнай установы. Бліжэйшым кінатэатрам з'яўляецца «Авангард», які знаходзіцца на Грушаўскім пасёлку, за два-тры кіламетры ад мікраёна.

— У нас няма месца, дзе сабраца жыхарам, каб правесці сход ці арганізаваць іншае цікавае мерапрыемства, — расказвае кіраўнік домаўпраўлення № 3 Уладзімір Ігнатавіч Трусаў. — Няма памяшкання, каб адкрыць чырвоны куток, дзе можна было б трымаць газеты, часопісы, кнігі, арганізаваць фізкультурныя і спартыўныя групы, праводзіць лекцыі, работу з агітатарамі, актывам домаўпраўлення, а магчыма, арганізаваць і народны універсітэт. Не прадугледжана такога месца і ў новых будынках, якія ўзводзяцца цяпер.

Слушныя і цікавыя думкі настаўніка працоўнага выхавання школьнікаў Пятра Гагарына. Ён сказаў:

— Часам бываюць выпадкі, калі людзі ад нямы чаго рабіць п'юць гарэлку, дрэнна сябе паводзяць на вуліцы. А быў бы ў нас добры клуб ці чырвоны куток, падобных фактаў было б значна менш. Самае галоўнае ў наш час —выхаванне чалавека, стварэнне яму добрых умоў для няўхільнага павышэння яго культуры і ведаў — усё гэта непасрэдна вынікае з праекта Праграмы КПСС.

Для ўздыму народнага дабрабыту выключна важнае значэнне набывае далейшае развіццё і паляпшэнне грамадскага харчавання. Добра наладжанае грамадскае харчаванне ў корані мяняе быт сям'і савецкага чалавека, вызваляе жанчыну ад лішніх клопатаў па хатняй гаспадарцы.

Аднак на тэрыторыі мікраёна няма ні сталовай, ні кафэ, ні закусачнай.

Жыхары мікраёна многа раз прасілі, каб ім адкрылі хоць невялічкую кафэ-закусачную. Мінула нямала часу, а справа ніяк не зрушыцца з месца.

Кафэ-закусачную можна зрабіць такой, што яна стане сапраўдным культурным асяродкам, а не проста месцам, куды забягаюць перакусіць. Няхай на сталах, разам з меню, будзе вялікі выбар свежых газет і часопісаў, надзённых брашур. Няхай прыходзяць сюды людзі, каб сустрэцца за шклянкай чаю са сваімі сябрамі, абмяняцца навінамі, з карысцю і з задавальненнем правесці вольны час.

У мікраёне і ў населеных пунктах, што знаходзяцца побач, ёсць шмат рабочых і служачых, якія працуюць у майстэрнях, магазінах і іншых установах. А колькі тут медыцынскіх работнікаў! І ўсе яны кожны дзень харчуюцца сухой ежай, бо сталовай няма. Праўда, для будаўнікоў тут часова адкрылі філіял-сталовую. Яна працуе ад сталовай тонхасуконнага камбіната. Але абеды для рабочых будаўніцтва дастаўляюцца сюды халодныя і нязмасныя. Падаграваць іх на месцы раздачы не хочуць.

Няма неабходнасці даказваць, як выгадна і эручна карыстацца паўфабрыкатамі, наколькі яны аблягчаюць працу гаспадынь. Раней дастаўлялі ў харчовыя магазіны мікраёна пельмені, катлеты, фарш. Цяпер чамусьці не завозяць.

Гандлёвыя арганізацыі, як бачна, не жадаюць займацца выпускам шырокага асартыменту паўфабрыкатаў. Не клапоцяцца яны і аб укараненні такіх прагрэсіўных форм гандлю, як выстаўка-продаж прадуктаў, развазны гандаль, прыём заказаў і дастаўка абедаў на дом.

На ўскраіне ёсць вялікая патрэба арганізаваць дамавыя кухні. Але яны не прадугледжаны нават у праектах новых будынкаў. Трэба выправіць такое становішча.

ЯШЧЭ НЯДАЎНА паміж шостым і другім цагельнымі заводамі была пустэча. Гэта былі калісьці самыя далёкія ад цэнтра горада прадпрыемствы. Цяпер тут вырас велізарны рабочы пасёлак.

Яркім электрычным святлом асвятлілася заходне-паўночная ўскраіна сталіцы. У прасторных, светлых дамах рабочых гараць лямпачкі Ільіча, гаворыць радыё, працуюць тэлевізары.

Многа прастору і святла ў навасёлаў новага рабочага пасёлка. І жыць бы, здаецца, людзям ды радавацца. Але часта розныя «дробязі» псуюць жыхарам настрой, дарэмна ўскладняюць іх жыццё.

Амаль у цэнтры новага рабочага пасёлка, стаяць побач чатыры, пахіленыя на бок, старыя прычэпы аўтакрам. Гэта і ўся гандлёвая «сетка» на вялікі рабочы раён, якая па задуме гарсавета павінна цалкам задавальняць патрэбы жыхароў. Але паглядзім, што ёсць у гэтых крамах.

Вось першая палатка. На паліцах яе ляжыць некалькі шпулек нітак, кавалкі чатыры матэрыялу і яшчэ сяжая-такая дробязь. Гэта — прамтаварная крама.

— Я спрабавала прасіць у Мінпрамгандлі дзіцячае адзенне — касцюмчыкі для хлопчыкаў, сарочкі, — расказвае прадавец гэтай палаткі Марыя Сцяпанаўна Казакевіч, — але мне гэтых тавараў не даюць. А попыт на іх цяпер надзвычай вялікі.

У другой аўтакраме прадаецца гарэлка. Напэўна, кіраўнікам Мінхарчгандлю выгадна прадаваць яе тут, бо ў цэнтры горада яна адпускаецца ў магазінах толькі ва ўстаноўленыя гадзіны, а тут гандлююць без усялякіх абмежаванняў.

Трэцюю палатку аблюбаваў сабе вартаўнік. У чацвёртай ідзе гандаль хлебабулачнымі вырабамі. І вось, як ні дзіўна, але тут заўсёды чарга. Людзі чакаюць, калі прывязуць хлеб. Работніца завода медпрэпаратаў Валянціна Слышкова не вытрымала:

— Калі гэта ўсё скончыцца. Прыйшла на абед з работы, а хлеба ў магазіне яшчэ не прывезлі. А без хлеба, самі ведаеце, няма і абеду.

— І такое здараецца часта, — амаль у адзін голас загаварылі жанчыны.—Каб купіць хлеб ці батон, даводзіцца дабірацца ў цэнтр горада.

— У нас нават няма кіёска, дзе б можна было, ідучы на работу купіць свежы нумар газеты, пасопіса, кнігу,—гаворыць рабочы завода жалезабетонных вырабаў Іван Шыбко. — Няхай бы хоць час ад часу прыязджала да нас кніжная аўтакрама. Дык вось у цэнтры горада, дзе шмат кніжных спецыялізаваных магазінаў, побач з імі заўсёды ўбачыш і аўтакрамы і столікі з кнігамі. А нам жа таксама патрэбна і кніга, і газета, і дзецям аловак ды сшытак.

Так вось клапоцяцца кіраўнікі гандлёвых арганізацый Мінска пра пакупнікоў, якія жывуць у аддаленых ад цэнтра месцах. Яны нават не заўважаюць, як хутка расце і расшыраецца горад. Сёння ўскраіна — заўтра цэнтр. Тры гады назад пачалося будаўніцтва мікраёна па Сталінградскай вуліцы. А сёння тут ужо вырас цэлы горад. Ёсць дзіцячы сад і яслі, вялікая школа. Не шанцуе толькі магазіну. Меркавалася, што ён уступіць у строй у канцы мінулага года. Потым адкрыццё яго адклалі да Першага мая. Мінуў і гэты тэрмін. Жыхары гэтага раёна згубілі ўсялякую надзею, што сёлета яны, нарэшце, будуць мець свой магазін.

Чаму ж так атрымліваецца, што ў гандлёвых арганізацыях нашай сталіцы ёсць сынкі і пасынкі?

У жыхароў ускраіны, што за асфальтаванай шашою, якая ідзе на цагельны завод № 2, ёсць і яшчэ шмат слушных патрабаванняў. У прыватнасці, тут няма ніводнай майстэрні па рамонту абутку, адзення. Калі трэба чалавеку пагаліцца або сфатаграфавацца, даводзіцца таксама ехаць у цэнтр горада. Аб тэлефоне-аўтамаце і размовы быць не можа.

— Іншы раз здарыцца бяда, захварэе чалавек, і — што хочаш рабі, — скардзяцца жыхары. — Бегчы ў горад — далёка, ехаць — не ходзяць аўтобусы.

А трапіць у цэнтр горада адсюль нялёгкая справа. Гады два назад каля пасёлка хадзіў аўтобус па маршруту Ленінградская—цагельны завод № 2. Цяпер гэты маршрут нехта адмяніў. І людзям дабавілася клопату. Да бліжэйшага аўтобуснага прыпынку, што на Грушаўскім пасёлку, дваццаць кіламетры. І жыхарам даводзіцца кожны дзень адмяраць гэтую адлегласць, ідучы на работу і вяртаючыся вечарам дадому. А як адчуваюць сябе вучні, асабліва пачатковых класаў? Ім жа таксама трэба хадзіць па тры-чатыры кіламетры да школы і столькі ж назад. Іншай школы тут пакуль што няма.

Дамы стаяць тут прыгожыя, з высокімі і светлымі вокнамі. А вось па вуліцах ні праехаць, ні прайсці. Узнікае законнае пытанне. Дзе ж інжынер райкамунгаса Кастрычніцкага раёна? Ці бывае ён тут? Яго ж прамы абавязак сачыць за добраўпарадкаваннем вуліц.

НЕАБХОДНА кінуць сур'ёзны папрок і жыхарам гэтага пасёлка. Не любяць яны свайго лепшага сябра — зялёных насаджэнняў, не вядуць сапраўднай барацьбы за прыгажосць родных мясцін. Нават на галоўных вуліцах пасёлка, такіх, як імя Талаша, Глаголева, Прылуцкага, Азоўскай, не ўбачыш ніводнага дрэва, ніводнай кветкі. На прысядзібным участку кожнага дома пасаджаны добрыя сады. А вось на вуліцы, ля свайго дома пасадзіць дрэва ці кветку ніхто не дадумаўся. І вулічныя камітэты, і школьнікі, якіх тут нямала — ніхто не праявіў ініцыятывы.

Кожны індывідуальны забудоўшчык абавязан зрабіць ля свайго дома і тратуар. Тым не менш, новыя дамы растуць, нібы грыбы пасля дажджу, а пра тратуары забудоўшчыкі і не дбаюць. За добраўпарадкаваннем і чысцінёй пасёлка павінны больш пільна сачыць і Кастрычніцкі райвыканком і раённае аддзяленне міліцыі.

Трэба прымаць захады, каб ліквідаваць адзначаныя недахопы.

**І. РЫБЧЫНСКІ,**
**слухач Мінскай вышэйшай партыйнай школы.**

## Беларускія мастакі рапартуюць

Р. КУДРЭВІЧ. «Беларускія прыпеўкі».

## НОВЫЯ ЎСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ

**У рэспубліцы вядзецца вялікае будаўніцтва новых устаноў культуры. У Мінскай вобласці за сем месяцаў бягучага года пабудавана больш дваццаці сельскіх клубаў. У Дзяржынску, Мядзелі, Крыжах пабудаваны раённыя дамы культуры. РДК будуюцца таксама ў Смалявічах, Крупках, дамы культуры — у Чырвонай Слабадзе Старобінскага раёна і Свіры Мядзельскага раёна.**

**38 калгасных клубаў пабудавана ў Магілёўскай, 25 — у Брэсцкай абласцях. Новая музычная школа адкрыта ў Стаўбцах. Новыя клубы на 300 і 150 месц пабудаваны ў калгасе «12 год Кастрычніка» Рагачоўскага раёна і ў саўгасе «Ціхінічы» Гомельскай вобласці.**

# ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ВЫСТУПІЛА НАША ГАЗЕТА

**21 ліпеня гэтага года ў нашай газеце быў змешчаны артыкул Д. Жураўлёва «Хай струны цымбалаў гучаць галасней». Як паведамілі з Рэспубліканскага Дома народнай творчасці, у артыкуле правільна ўскрываюцца недахопы, якія тармозяць далейшае развіццё і рост цымбальных самадзейных аркестраў у рэспубліцы. У сувязі з гэтым Дом народнай творчасці вырашыў правесці дзесяцідзённы семінар кіраўнікоў цымбальных аркестраў, аказаць практычную і метадычную дапамогу на месцах гэтым інструментальным калектывам аматараў і заказаць для іх спецыяльны рэпертуар.**

**Станоўчы водгук на выступленне газеты атрыман ад кіраўніцтва Барысаўскай фабрыкі піяніна. Яе дырэктар тав. Вайткевіч піша, што, ідучы насустрач пажаданням аматараў музыкі, фабрыка прыступіць да вырабу цымбал у чацвёртым квартале 1961 г.**

**Галоўны рэдактар Дзяржвыдавецтва БССР І. Казека паведаміў рэдакцыі, што сёлета выйшлі ў свет «П'есы для цымбал з фартэпіяна» Д. Камінскага. Планам рэдакцыйнай падрыхтоўкі прадугледжана выданне брашуры І. Жыновіча «Аркестр цымбалістаў» у якасці дапаможніка для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. У той жа час І. Казека адзначае, што заказы кнігагандлюючых арганізацый на такі від літаратуры вельмі нязначныя. Так, «П'есы для цымбал з фартэпіяна» выдадзены тыражом у адну тысячу экземпляраў. Яшчэ ніжэйшыя тыражы іншых выданняў, якія выпускаюцца ў дапамогу музычным калектывам. Большая частка тыражу «Школы для беларускіх цымбал» І. Жыновіча не была прынята для рэалізацыі кнігагандлюючымі арганізацыямі з-за адсутнасці заказаў, праляжала некалькі год на складзе выдавецтва і была спісана.**

**Да такіх трывожных фактаў нельга не прыслухацца. Яны сведчаць аб тым, што прапаганда музычнай літаратуры, асабліва ў сельскай мясцовасці, пушчана на самацёк і кнігагандлюючыя арганізацыі амаль ёю не займаюцца.**

**Як жа рэагаваў на артыкул Д. Жураўлёва Белкаапсаюз, ад якога ў першую чаргу залежыць распаўсюджанне і рэалізацыя нотных выданняў і музычных інструментаў на вёсцы? Вось што піша начальнік гандлёвага ўпраўлення Белкаапсаюза Г. Котаў: «У свой час Белкаапсаюз заказаў 300 цымбалаў і завёз іх у гандлёвую сетку. Аднак з-за адсутнасці попыту гэтыя цымбалы пасля працяглага захавання былі спісаны як непрыгодныя». Такім чынам тав. Котаў загадзя распісаўся ў бездапаможнасці спажывецкай кааперацыі, якая не распаўсюджвае належным чынам беларускія народныя інструменты ў шырокіх масах і не ўмее зрабіць так, каб яны былі рэалізаваны сярод сельскіх аматараў музыкі. Нельга таксама пагадзіцца і з такім сцвярджэннем тав. Котава, быццам бы «цымбалы не з'яўляюцца масавым інструментам» і таму, маўляў, вытворчасць іх павінна весціся толькі па папярэдніх заказах. Няхай і па папярэдніх заказах, але ж гэтыя заказы ад сельскіх дамоў культуры і калгасных клубаў павінны рабіць іменна работнікі Белкаапсаюза, каб потым перадаваць іх на Барысаўскую фабрыку.**

ПА ГАРАДАХ РЭСПУБЛІКІ. Гродна сёння. Савецкая плошча.

Фота Ч. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

## Сярод кніг

# АД ІМЯ ПАКАЛЕННЯ

«Неспакой» — новая, пятая па ліку кніжка вершаў Ніла Гілевіча. Я гартаю, перачытваю яе, і мне становіцца зразумела, чаму аўтар даў ёй такую назву.

Так, неспакой «па нечым вялікім, прыгожым і светлым», неспакой за сваю «нялёгкую работу», неспакой і за сваё пакаленне, і за тых, каму сягоння «стукнула дваццаць», неспакой творчасці.

...Гляджу на хлопцаў і пытаю
Сябе, трывожачыся ўпотай:
А я—ці так люблю і знаю
Сваю нялёгкую работу?

Гэта пачуццё адказнасці, пачуццё высокай патрабавальнасці да сябе і да свайго пакалення не пакідае паэта на працягу ўсяе лірычнае размовы, якую ён задушэўна і шчыра вядзе з чытачом-сучаснікам.

Адніго хачу на гэтым свеце:
Так пяладзіць а доляю зямной,
Каб кіномі не прыйшлося дзецям
Чырванець за зробленае мной.

Так, у век пакарэння космасу, пакарэння атама, нечуванай творчай актыўнасці народных мас, вызначэнне свайго месца ў вялікім творчым працэсе становіцца вядучай тэмай і ў паэзіі. Яно ператвараецца ў пакутлівыя пошукі новых спосабаў адлюстравання сучаснасці, у высакароднае імкненне бачыць свайго сучасніка носьбітам вялікіх ідэалаў будучыні. Таму зварот да тэмы перажытага, да тэмы вайны магчымы для паэта толькі з пункту погляду сучасніка: а як жа маладое пакаленне, ці варта яно тых вялікіх ахвяр і подзвігаў, якім адзначаны лёс старшага пакалення?

І роздум мяне ахінуў на грудку
Пра тых, каму стукнула дваццаць:
Ці кожны, паклаўшы на сэрца руку,
Байцом бы мог сёння назвацца?

Адсюль, ад гэтага шчырага неспакою за чалавечую годнасць маладога сучасніка, ідзе і тая непрымірымасць да перажыткаў мінулага, да тых, хто яшчэ не знайшоў свайго месца ў агульным страі. У гэтым сэнсе адзін з лепшых вершаў зборніка — «Замок», дзе багатымі паэтычнымі сродкамі выказаны гнеў і пагарда да перажыткаў мінулага і да іх носьбітаў. Праз дробную жыццёвую дэталь паэт ідзе да вялікага філасофскага абагульнення.

Кольмі сіл маіх ёсць —
Ненавіджу замкі
на дзвярах,
на варотах,
І на сэрцах людскіх...

Сімвал мінулага, сімвал уласнасці, сімвал хціўнасці — замок становіцца той дэталлю, праз якую паэт дасягае вялікага паэтычнага абагулу і глыбокага раскрыцця тэмы сучаснасці, тэмы будучыні.

Чалавек на зямлі
будзе жыць без замкоў.
Бо замкі — сваякі
збітых рабскіх акоў.

У іншым праламленні гэтая тэма неспакою за маральную чысціню маладога пакалення, за яго высакародны воблік праходзіць і ў вершах «Калі чалавеку не больш дваццаці...», «Здарэнне на выстаўцы шкла», «Пра шпаргалку», «Пра тытул».

Ну што ж,
Мы з такога не робім сакрэты:
Відаць,
Не без вырадка наша сям'я.
Адно толькі крыўдна,
Што вырадак гэты
Есць хлеб наш
І носіць імя!

І зусім заканамерна, што гэтая тэма, тэма адмаўлення ўсяго ганоснага, што прыліпла на нейкі час да маладога пакалення, — не асноўная тэма творчасці паэта. Лірычны герой паэта — перш за ўсё чалавек высокага прызвання, чалавек-стваральнік новага жыцця, чалавек з багатым і вялікім духоўным багажом. Рысы новага чалавека паэт убачыў і раскрыў у такіх вершах, як «Балада пра пераможны акіян», «Да спаткання, зямля», «На канцэрце ў сталіцы», «Будзь жа ўдзячнаю», «Настаўнік», «Часцей, часцей прыпамінай...», «Роздум перад кніжнай паліцай» і інш.

Глыбокі лірычны роздум, усведамленне велічнасці часу і яго нястрымнага поступу, светлая паэтычная ўзнёсласць, сцвярджэнне жыцця, сыноўняя любоў да маці-радзімы, замілаванне непаўторнымі карцінамі роднай прыроды — вось матывы лірыкі Ніла Гілевіча. Тэматычна разнастайныя вершы аб'яднаны адным пачуццём, адным настроем, асветленым «задушэўнасцю і мяккасцю лірычнага голасу паэта.

О, Зямля!
Ты ўся ў абновах!
Ты ў мільён званочкаў звоніш,
Ты на ста пявучых мовах
Весняй радасцю гамоніш.

Або:

Сонца, сонца!
Ну і сонца!
Хай жа ў можным чэсным року
Сонца свеціцца здалёку,
Каб маглі пазнаць усе,
Хто ў жыцці не любіць зыроку,
Хто ў душы святло нясе!

У лірычных вершах Ніла Гілевіча найбольш выразна адчуваецца тая асноўная, вядучая тэндэнцыя нашай маладой паэзіі, у якой арганічна спалучаюцца матывы грамадзянскай лірыкі з так званай асабістай лірыкай; у якой асабістае, задушэўнае цесна і неразрыўна спалучана з грамадскім; у якой светаадчуванне паэта прасякнута высокімі ідэаламі будучыні, здаровым і свежым дыханнем часу.

Можа, таму ў зборніку няма ні вершаў, ні матываў цалкам біяграфічнага парадку. Біяграфія паэта як бы зліта з біяграфіяй часу.

Я шчаслівы, што ў суджаны час
Нарадзіўся на гэтай зямлі,
Дзе такія густыя лясы
І такія спакойныя рэкі,
Дзе вясной непаўторна шторазі
Зеляненюць разлогі-палі,
Дзе ўладар гэтай даўнай красы—
Ты, народ мой, на вечныя векі!

Прыемна адзначыць, што ў паэзіі Ніла Гілевіча амаль няма дэкларацыйнасці і агульнасці, чым так часта хварэе паэтычная маладосць у час пошукаў і вызначэння свайго паэтычнага кірунку. Няма ў ёй і так званага паэтычнага эмпірызму, дзе пануе адарванасць асобна ўзятага факта ад шырокай плыні жыцця і дзе паэзія не дасягае высокіх абагульненняў, а знаходзіцца ў палоне суб'ектыўнага ўспрыймання паасобных з'яў. Ды і наогул трэба сказаць, што як паэт Ніл Гілевіч можа быць аднесен да «маладых» толькі ўмоўна. Хаця яго творчая біяграфія налічвае не многа гадоў, мы маем перад сабою паэта з самастойным своеасаблівым і выразным паэтычным голасам.

Есць у вершах Гілевіча і патрэбнасці, недакладнасць вобраза або часам і прымітыўнасць яго. Напрыклад, рэжуць слых такія параўнанні, як «Млела ўсё навокал, нібы зямлю хто варам абварыў», або «Вечар сіньку развёў за акном», «Сосен зябкія плечы дымка ўжо спавіла», «Песня загучала, як быццам лівень хлынуў з вышыні», або дыялектнае «Гэта права займеш», або «А цяпер — абеліскі, пні-пянёчкі наўкола». (Цяжка сабе ўявіць «пянёчак» у выглядзе «абеліска» — непараўнальныя рэчы!) Не ўпрыгожвае кніжку і вучнёўскі, альбомнага зместу «Трыялет».

Няхай творчы неспакой не пакідае паэта Гілевіча ў яго новых вершах і кнігах. Думаецца, што чарговая сустрэча з паэтам будзе яшчэ больш прыемнай.

**Алесь ЗВОНАК.**

# УСХВАЛЯВАНЫ ГОЛАС

Тэма мінулай вайны і барацьба за мір — галоўная ў новым зборніку М. Смагаровіча «Маё выступленне». Сам былы воін, паэт рашуча ўзнімае гнеўны голас пратэсту супраць тых, хто сёння з упартасцю вар'яту размахваюць палачай галавешкай над парахавым пограбам.

Ніколі не забудзе чалавецтва пра мільёны ахвяр, пра людзей, якія загінулі ў акопах, расстраляны ў фашысцкіх засценках, атручаны ў газавых камерах, спаленыя ў лагерах смерці.

Мы знаем, як старвалі з гора маці,
Не дачакаўшыся з вайны сваіх сыноў.
Нам не забыць, як страшны крык дзіцяці
І бомбаў выбухі зліваліся ў адно, —

піша М. Смагаровіч у вершы «Свету — мір!»

Успамінаючы пра вайну, пра тое, як нашы воіны на штыках неслі «свабоды сонца ў Прагу і Варшаву», каб блакіт сённяшняга неба не быў азмрочаны чорнымі выбухамі бомбаў, паэт выказвае ўпэўненасць, што людзі свету не дапусцяць новай вайны.

Нам дружыць патрэбна між сабою
І стаяць за мір — плячо к плячу. —
Сустракаць вас не на полі бою,
А на фестывалях я хачу, —

звяртаецца ён да людзей іншых краін.

Палову зборніка займае аўтабіяграфічны твор «Юнацтва маё баявое» са сціплым аўтарскім падзагалоўкам «З партызанскіх нататкаў». Гэта расказ аб бачаным і перажытым — аб першых днях акупацыі, аб збіранні народных сіл і самаадданай барацьбе з ворагам. Паэт не ставіў мэтай стварыць шырокае мастацкае палатно. Гэта лірычны дзённік, які, аднак, перадае атмасферу ўсенароднай барацьбы супраць фашызму. Энергічны, як бы ўсечаны радок, поўны ўнутранай сілы, і простая апавядальная манера як нельга лепш адпавядаюць суроваму драматызму часу, пра які гаворыцца. Паказам нягод вайны паэт як бы адцяняе веліч сённяшняга мірнага дня і заклікае яшчэ больш актыўна змагацца за мір.

Многія вершы М. Смагаровіч прысвячае Радзіме, Камуністычнай партыі. Паэт услаўляе працоўныя подзвігі савецкіх людзей, багацце і прыгажосць іх душы.

У вершы «Хлеб» паэт расказвае аб часах свайго маленства, калі ў вёсцы ішла жорсткая класавая барацьба. У ёй прымаюць удзел не толькі дарослыя, але і дзеці. Хлапчукі пільна сочаць за спробамі кулакоў перашкодзіць калгаскаму будаўніцтву і выкрываюць іх злачынныя намеры схаваць насенне. Аўтар праўдзіва паказаў непаўторны каларыт той эпохі. Тут і былыя батракі, якія ў задуменні «чухалі касматыя галовы», і дзеці, якім так хацелася «есці, што было зусім не да гульні». Шырокае абагульненне заключных радкоў—«Так знішчаць тады мы малышамі пачыналі голад на зямлі» падрыхтавана дакладнымі і вобразнымі папярэднімі дэталямі.

З вершаў М. Смагаровіча відаць, што аўтар іх умее па-мастацку асэнсаваць свой жыццёвы вопыт. Большасць твораў гучыць свежа і шчыра. Ад іх вее маладосцю, непасрэднасцю. Звяртаюць на сябе ўвагу пейзажныя замалёўкі «Вяска», «У лесе», «Прадвесне». Яны яркія і запамінальныя.

Трапіла ў зборнік і некалькі выпадковых вершаў. Сапраўды, ці варта было змяшчаць верш «Сасонка» дзеля выводу: «Сасонку вецер як ні гне, але ніяк не зломіць». Далёка не новы сімвалічны вобраз. Сустракаюцца ў зборніку сэнсавыя недакладнасці, выпадковыя параўнанні, яўныя празаізмы, дзе-нідзе чуецца рыторыка. Гэта — «выдаткі» творчасці. Зерні ж сапраўднай паэзіі, якія пераважаюць у новым зборніку М. Смагаровіча, і ёсць той ураджай, якім аўтар кніжкі шчодра дзеліцца з чытачом.

**Г. ЮРЧАНКА.**

# РАМАНТЫКА БАРАЦЬБЫ

Новая аповесць Пятра Валкадаева аб незабыўных днях Вялікай Айчыннай вайны адрасавана дзецям сярэдняга і старэйшага ўзросту.

Галоўны герой твора трынаццацігадовы Санька дапамагае ваеннапалонным вырвацца з лап фашыстаў, перадае партызанам важныя звесткі пра ворагаў, выкрывае шпіёнаў, якія прабраліся ў лагер партызанаў. Начальнік партызанскай разведкі Кастусь, былы шафёр райвыканкома, уступае ў няроўны бой з батальёнам карнікаў і вельмі дорага аддае сваё жыццё. Дзед Якуб, нястомны памочнік партызанскіх разведчыкаў, не жадаючы здацца ў палон, падрывае на «бомбе» разам з сабой некалькі ільжэдэсантнікаў — перапранутых фашыстаў.

Не баючыся папрокаў у «ідэалізацыі» герояў, аўтар імкнецца паказаць іх у рамантычным асвятленні.

У аповесці многа добрай выдумкі, вострых сітуацый, небяспечных прыгод, што заўсёды імпануе юнаму чытачу. Твор прасякнуты пафасам барацьбы, подзвігу ў імя Радзімы.

Аповесць П. Валкадаева своеасабліва адлюстроўвае тэндэнцыі, якія ў апошнія гады ўсё выразней праступаюць у ваеннай прозе. Пісьменнік імкнецца да паглыбленага псіхалагізму, да суровай праўды вайны. Цяжкім і гераічным быў лёс простага чалавека, радавога ўдзельніка вайны, і гэта ўвесь час стараецца падкрэсліць аўтар аповесці, рашуча адмаўляючыся ад аблегчанага паказу народнай героікі.

Вайна ўваходзіць у твор такой, якой яе ўбачылі Санька і яго дружбак Уладзік. Санька тры дні амаль не злазіць з сасны, усё глядзіць у той бок, дзе грыміць фронт. Уладзік не адстае ад сябра. «Ему тоже хочется увидеть, какая она там, война. Небось страшно—штыками колют, танками топчут...»

А вайна наляцела на гарадок зграяй самалётаў, забіла многа параненых чырвонаармейцаў, сінявокага кулямётчыка, з якім хлопцы паспелі пасябраваць (той дазволіў ім праехаць на возе з зенітнымі кулямётамі), смяротна параніла маці Санькі. У дом Уладзіка вайна ўвайшла ў вобразе нямецкага паслугача Герасіма Зайчыка. І гэта было тым больш складаным, балючым і страшным, што Герасіма, айчыма Санькі, Уладзік даўно ведаў.

Ваенныя выпрабаванні зрабілі падлеткаў дачасна сталымі. Ніколі не ўяўлялі яны, што здолеюць забіць чалавека, а давялося — прыстрэлілі фашысцкага халуя Верашчаку. І ўжо з адчуваннем уласнай сілы, каб перахітрыць гестапаўцаў, ідуць сябры ў нямецкую «музычную» школу, дзе хацелі зрабіць з іх маленькіх правакатараў-шпіёнаў.

Прымаючы ўдзел у барацьбе, дзеці вырастаюць духоўна. У іх абвастрыліся пачуцці пагарды і нянавісці, любві і спагады. Навакольны свет для іх стаў больш складаным і больш блізкім, а ўсё жывое—больш дарагім. Варта толькі ўслухацца ў нямую «размову» Санькі з Рыжухай, каб пераканацца ў гэтым. «Подняла голову Рыжуха, в упор смотрит на Саньку. И чудится ему в ее синеватых неподвижных глазах укор: «Плохой ты хозяин, Санька... Скрутил ноги веревкой, а мне и без пута тяжко...»

Кинулся Санька к Рыжухе, присел на корточки возле широких копыт, распутывает. А она положила морду ему на плечо, ловит губами рубашку...».

Для разумення ідэйна-мастацкай канцэпцыі аповесці вялікае значэнне мае наступны эпізод. Камандзір партызанскай брыгады Арлоў пасылае Кастуся ў Дручанск разведаць сілы і сістэму абароны гарнізона. У горадзе ў партызан ёсць свой чалавек, які працуе пад выглядам шаўца. Кастусю трэба звязацца з ім, але хлопца ў Дручанску ведае кожны трэці, Кастусь заходзіць да дзеда Якуба, доўга гутарыць з ім і вырашае даверыць старому вялікую тайну. Разведчык не памыліўся.

П. Валкадаеў не прымае той «канспірацыі», пры якой літаратурныя героі некаторых кніг нават маці і каханай не прызнаваліся, што ў іх на душы, за каго яны, —ён уступае ў вялікую размову аб адносінах паміж савецкімі людзьмі ў варожым тыле.

Добра сказаў аб гэтых адносінах у адным са сваіх апавяданняў Іван Навуменка. «Не было на свеце больш даверлівых людзей, чым падпольшчыкі і партызаны. Не правяралі ў той час мандатаў, не давалі даведак з пячаткай. Без іх знаходзіў чалавек дарогу да сэрца свайго паплечніка і аднадумца. Мабыць, на вайне, калі навісае пагроза не над адным асобным чалавекам, а над цэлым народам, мы проста лепш і праніклівей умеем бачыць, хто наш друг, а хто вораг».

Героі Валкадаева моцныя і тым, што яны глядзяць на людзей, якія засталіся на акупіраванай тэрыторыі, без непатрэбкай насцярожанасці і недаверу, вераць адзін аднаму, бачаць, хто друг, а хто вораг. І хоць многія з іх гінуць (фашысты закатавалі Уладзіка і яго маці, паміраюць героямі Кастусь, дзед Якуб, камуніст-партызан Шульга), але гінуць не ад недахопу канспірацыі.

З галоўных герояў аповесці ў жывых застаюцца толькі Санька і сакратар райкома Арлоў. Нягледзячы на гэта, атмасфера твора аптымістычная, уся аповесць прасякнута верай у чалавека, яна жыццесцвярджальная. Тэма даверу да чалавека ў аповесці пераходзіць у тэму высокай чалавечай годнасці савецкага грамадзяніна. Нельга, сцвярджае пісьменнік, вытруціць у савецкім чалавеку чалавечае, заглушыць усведамленне ў ім сваёй высакароднай сутнасці і высокага прызначэння.

Вельмі паказальная ў гэтым сэнсе сцэна ў лагеры для ваеннапалонных. Здавалася б, што ў знясіленых голадам і холадам палонных прачнецца звер, калі ім кінуць якую-небудзь ежу. На гэта і разлічвалі фашысцкія вылюдкі, прывёзшы ў лагер сырыя буракі. Да хвастоў запрэжаных у вазы з буракамі коней фашысты прывязалі аблітую нафтай салому, падпалілі яе і пусцілі ашалелых жывёлін у вароты лагера.

Коні насіліся па лагеры, збівалі з ног людзей, тапталі іх капытамі, нявечылі. А людзі не ўцякалі, кідаліся насустрач, цягнуліся да буракоў. Немцы ўлюлюкалі, дзіка рагаталі.

І раптам на адзін з вазоў ускочыў чалавек у зялёнай пагранічнай фуражцы. «Над нашей бедой тешатся враги!.. Товарищи! — взметнулся над лагерем его басистый голос...—Товарищи! — еще раз бросил пограничник в толпу это берущее за сердце слово. — Конвоиры устроили людоедский спектакль... Не теряйте в себе человека! Будем людьми до конца...»

Натоўп прыціх, пачаў адступаць назад, некаторыя пачалі кідаць мокрыя буракі пад ногі пагранічніку. А той ужо загадваў: «Станьте в очередь! Каждый третий бери одну свеклину и раздели ее с товарищами!»

Кідаецца ў вочы, што высокая гуманістычная ідэя, закладзеная ў гэтай эмацыянальнай сцэне, атрымала занадта пафаснае выяўленне. Удумваючыся ў гэтую акалічнасць, мы зноў падыходзім да пытання, як суадносіцца аповесць з сучаснымі творамі аб вайне.

Імкнучыся да глыбокай жыццёвай праўды ў паказе вайны, П. Валкадаеў у той жа час хоча пераадолець бар'ер прыземленай рэалістычнасці, неяк «рэабілітаваць» рамантыку, якой старанна пазбягаюць многія аўтары новых твораў аб вайне. У аповесці бытавое спалучаецца з падкрэслена гераічным, звычайнае—з выключным, рэалістычнае — з сімволікай. Прыўзнятая танальнасць, паэтычнасць прабіваюць сабе дарогу нават праз чыста бытавы матэрыял.

Амаль непазбежная пры рамантычным успрыманні рэчаіснасці сімвалічная прыўзнятасць і шматзначнасць сітуацый і характараў не шкодзіць аповесці П. Валкадаева толькі да таго часу, пакуль пісьменнік не губляе рэалістычнага пачуцця. Нярэдка ж ён збіваецца на рамантыку слова, пачынае манернічаць, какетнічаць фразай, уплятаць у стылявую тканіну такія вось узоры: «Бродит по берегу вечер. Синий картуз звёздами вышит. Околыш картуза—алый, алый...

Бродит.
Ералашит.
Лещину тормошит.

Сунется на бугор к елочкам — топоршатся злючки, колючими рукавами отмахиваются. Опять к речке пойдет, надломит тростинку. Дудит. Дрему на берегу пугает». Або яшчэ: «В далекой синеве плещется рыжее предзакатное солнце. Пасутся облака—белые, кучерявые. Два облачка отбились, бродят над лесом на краю неба. Подпасок-ветер настигает их, гонит назад, к отаре».

Ад такой «рамантыкі» недалёка да сусальнасці.

Пры стварэнні вобразаў аўтар часам ідзе па самаму лёгкаму шляху, збіваючыся на плакат. Фашысты ў аповесці — набіўшыя ўжо аскоміну ёлупні, дурні. Пра аднаго з іх аўтар так і гаворыць: «Бритоголовый, коренастый, он был похож на высоко спиленный еловый пень».

Шаблон пракрадваецца і ў лагер станоўчых герояў. У вобразе Санькі адчуваецца нешта ад традыцыйнага хлопчыка-сіраты, гэтак жа, як у вобразе старога Якуба нешта ад літаратурнага дзеда, які ўсё ведае, усё бачыць і ўсё можа.

Нельга не сказаць і аб надакучлівым паўтарэнні некаторых дэталей, якія чым небудзь спадабаліся аўтару. У зямлянцы «густо пахнет живицей», у лесе «воздух пропах смолой-живицей», партызаны пакідаюць зямлянкі «с пряным запахом живицы». Санька адскочыў ад Верашчакі так, як «дети обычно шарахаются от ядовитой змеи». Той жа Санька адхіснуўся ад Герасіма з такім адчуваннем, нібы ён «невзначай наступил ногой на змею...» У аповесці калі ўжо кураць, дык «свирепо», калі зацягваюцца, дык не абы-якім, а «свирепым» самасадам.

Непераадоленая ўлада традыцыйных стылявых прыёмаў, якія ўжо даўно з'яўляюцца для нашай прозы пройдзеным этапам, моўнае штукарства, аднастайнасць некаторых выяўленчых сродкаў—усё гэта вельмі перашкодзіла П. Валкадаеву на шляху ў свет рамантыкі.

**С. ГУСАК.**

**Пятро Валкадаеў.** «Чей мальчишка?» Аповесць. Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Мінск, 1961.

## Беларускія мастакі рапартуюць

Праходчык Салігорскага камбіната Акалелаў. Работа маладога скульптара С. ВАКАРА.

## 500 ТВОРАЎ НАРОДНЫХ УМЕЛЬЦАЎ

Гродзенская абласная выстаўка работ самадзейных майстроў выяўленчага і прыкладнога мастацтва прысвечана XXII з'езду КПСС.

Наведвальнікі доўга затрымліваюцца ля твораў калгасніка сельгасарцелі «Кастрычнік» Гродзенскага раёна С. Быка. Народны ўмелец выразаў з двухмятровага кавалку клёну фігуру першага ў свеце касманаўта, Героя Савецкага Саюза Ю. А. Гагарына, які стаіць наля карабля-спадарожніка «Усход». Падняўшы ўверх правую руку, ён развітваецца перад палётам у космас з праводзячымі яго людзьмі.

Разбяр па дрэву, настаўнік П. Вусловіч з Ашмянскага раёна прадставіў на выстаўку барэльефы «Пакарэнне космасу» і «Перадавая даярка».

На Гродзеншчыне добра вядома імя выпальшчыка па дрэву Ш. Тарадзе з Дзятлаўскага раёна. За апошнія гады ён стварыў каля 40 розных твораў. Высокую ацэнку прафесіянальных мастакоў атрымала яго сюжэтная карціна «Песня», якая экспануецца на выстаўцы.

Многа месца адведзена творчасці турбамашыніста Гродзенскай электрастанцыі А. Ліпеня. Рабочы прадставіў на выстаўку гіпсавую скульптуру выдатнага дзеяча польскага рэвалюцыйнага руху, генерала Парыжскай камуны Валерыя Врублеўскага, а таксама бюст свайго земляка, выдатнага беларускага рэвалюцыянера Кастуся Каліноўскага і скульптуру вялікага рускага кампазітара П. І. Чайкоўскага.

Свае падарункі XXII з'езду падрыхтавалі і жыхарыцы. Мастак-аматар Н. Лагута з Гродна выставіў карціны «На ўборцы бульбы», «На малацьбе», «Пастушка-заночніца». Жывое ўяўленне аб прыродзе прынёманскага краю дае карціна канструктара Гродзенскага завода бытавых прыбораў Н. Верабʼёва «Бярозавы гай».

На выстаўцы прадстаўлена каля 500 работ народных умельцаў Гродзеншчыны.

## СЦЭНЫ ВЯСКОВАГА ЖЫЦЦЯ

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача паказаў прэм'еру па п'есе маладога беларускага драматурга Івана Козела «Канчане — суседзі мае». У п'есе адлюстравана сённяшняе вясковае жыццё.

Сваю новую работу калектыў тэатра прысвячае XXII з'езду КПСС.

Спектакль пастаўлены галоўным рэжысёрам тэатра Л. Мазалеўскай. Мастацкае афармленне І. Пешкура. Песні кампазітара Ю. Семяняні.

На нашых здымках — сцэны са спектакля. У ролях: Жані — артыстка Р. Маленчанка, Васіля— артыст Б. Барысёнак (здымак справа); Шыдлоўскага Язэпа — артыст Ул. Говар-Бандарэнка, Шыдлоўскай Антаніны—артыстка Ю. Фляйта.

Фота Ул. КРУКА.

## Навіны Радзімы

□ У дзень адкрыцця XXV з'езда Камуністычнай партыі Беларусі мінскі мінатэатр «Зорка» наладзіў для гледачоў музычную гутарку «Партыя—наш рулявы». З лекцыяй на гэту тэму выступіў камсультант гарадской нетна-музычнай бібліятэкі М. Жухавіцкі.

Артысты А. Купрыянава, Ю. Матраеў, А. Болатаў выканалі песні Ул. Алоўнікава, І. Ронькіна, Г. Вагнера, І. Думаўскага аб Партыі, Радзіме, гераічным савецкім народзе, камсамоле.

□ Вялікі канцэрт майстроў мастацтва БССР быў наладжаны для работнікаў аўтаінспекцыі горада Мінска.

Перад прысутнымі выступілі артысты Л. Бражнік, Т. Німнікава, Я. Палосін, Л. Ражанава, В. Глушаноў, В. Крынава, М. Шэхаў, П. Дружына, М. Кузьменка, В. Чарнабаеў, І. Ланштанаў, А. Стэрлін, Я. Марозава, А. Валошын.

У праграму канцэрта былі ўключаны песні беларускіх аўтараў, рамансы і арыі з опер рускіх і зарубежных кампазітараў, класічныя і характарныя танцы.

□ Са справаздачным канцэртам перад грамадскасцю гарадскога пасёлка Капыль выступілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці клуба Мінскага трактарнага завода.

Слухаючы цёплы сустрэлі выступленне самадзейных артыстаў сталіцы.

Трактаразводцы выступілі таксама з вялікім канцэртам перад удзельнікамі раённай нарады членаў брыгад камуністычнай працы.

□ Пры Пінскай гарадской бібліятэцы пачалі работу трохмесячныя курсы па падрыхтоўцы сельскіх бібліятэкараў.

Праграма разлічана на 400 вучэбных і практычных гадзін.

□ Штогод Магілёўскі абласны драматычны тэатр аддае адзін месяц абслугоўванню вёскі. Сёлета тэатр дзвюма групамі, кожная з якіх ставіла свой спектакль, пабываў у Клімавіцкім, Касцюковіцкім, Крычаўскім, Горацкім, Краснапольскім і іншых раёнах Магілёўшчыны, выступаў на сцэнах раённых дамоў культуры, калгасных і саўгасных клубаў.

Сельскія гледачы ўбачылі спектаклі «Востраў Афрадзіты» А. Парніса і «Час нахаць» Б. Ласкіна. Было дадзена 50 спектакляў, якія праглядзела больш 15 тысяч хлебаробаў.

Артысты С. Бульчык, М. Радзіёнаў, М. Бярозкін, З. Малчанава, рэжысёр тэатра А. Раеўскі аказалі метадычную дапамогу самадзейным драматычным калектывам, праводзілі з аматарамі сцэнічнага мастацтва гутаркі аб рэжысуры, майстэрстве акцёра, афармленні спектакляў.

# АГІТБРЫГАДА «ДРУЖБА»

Агітбрыгада «Дружба». Гэты малады калектыў ужо добра ведаюць, паспелі палюбіць гледачы Ашмянскага раёна Беларусі і Вільнюскага Літоўскай ССР. Ён нарадзіўся ў выніку творчай садружнасці двух дамоў культуры братніх рэспублік.

У літоўцаў вялікім поспехам карыстаецца беларуская песня «Не шукай», а беларусы заўсёды горача апладзіруюць літоўскай «Рамунеле». Нібы спаборнічаюць паміж сабой танцоры ў імклівых танцах «Лявоніха» і «Клумпакас».

«Дружба»—такая назва агітбрыгадзе дадзена не толькі таму, што яна выконвае песні і танцы суседніх народаў. Выканаўцамі іх з'яўляюцца самадзейныя артысты—літоўскія і беларускія юнакі і дзяўчаты Ашмянскага і Вільнюскага раёнаў. Любоў да мастацтва падружылі Яўгенію Старкевічутэ, Уладзіслава Шалавеюса, Альдону Куртрайтэ і Паўла Данілава, Яўгенію Архіпаву, Галіну Яцкевіч і многіх іншых.

Дамы культуры абодвух раёнаў разам намячаюць рэпертуар, маршруты паездак, узгадняюць месцы сустрэч для сумесных выступленняў. Падрыхтаваную імі праграму за апошні час ужо глядзелі і слухалі ў 20 беларускіх і літоўскіх калгасах і саўгасах. Цяпер рыхтуецца новая праграма ў гонар XXII з'езда КПСС.

У творчай дружбе знаходзяцца і два іншыя калектывы гэтых раёнаў. У Ашмяны прыязджаў Народны тэатр Вільнюскага клуба імя Дзяржынскага. Ён паказаў свой спектакль «Пасля разлукі». Гэтымі днямі вядомы ў Беларусі Ашмянскі народны тэатр наведаў пасёлак Рудаміны Вільнюскага раёна і паказаў літоўскім гледачам свой спектакль «Паўлінка». Тая і другая пастаноўкі абмяркоўваліся абодвума творчымі калектывамі.

У Ашмянскі народны тэатр прыйшло чарговае пісьмо з Вільнюса. Рэспубліканская студыя тэлебачання просіць беларускіх самадзейных артыстаў прыехаць у канцы верасня ў сталіцу Літвы. Выбар выпаў на пастаноўку «Паўлінка», высока ацэненую майстрамі Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

БЕЛТА.

Салісты агітбрыгады «Дружба» Г. Іванова і Г. Яцкевіч выконваюць песню Ю. Семяняні «Дзявочая лірычная». Акампаніруе В. Карасёў.

Фота З. ЛУКШЫ.

# ЦЫРК ЗАПАЛІЎ АГНІ

Мінскі дзяржаўны цырк пачаў свой новы сезон. Выступае Беларускі калектыў. Праграма, якую ён паказвае, называецца «Бывайце здаровы».

Мне даручана расказаць аб гэтай праграме чытачам газеты. Іду на паказ і міжволі думаю: як расказаць? Звычайна крытыкі цыркавых праграм робяць так, як гаворыцца ў прыказцы: «Усім пакрысе». Зрабіць так на гэты раз, будзе бадай што не зусім правільна. Ужо адна назва праграмы гаворыць аб тым, што цыркавы калектыў зрабіў заяўку на ансамблевы паказ. Значыць, кожны выканаўца будзе імкнуцца ўнесці нешта сваё ў адзінае цэлае.

Дык як жа расказаць аб новай праграме?

Непадалёку ля ўваходу ў цырк я звярнуў увагу на двух мужчын. Адзін — хударлявы брунет з добрай чупрынай, з вачыма-агеньчыкамі і шчырай усмешкай. Другі — таўсцяк, бландзін з залысінай і шэрымі, сумнымі вачыма. Адразу відаць — Аптыміст і Песіміст.

Мужчыны размаўлялі.

— Пойдзем у цырк. Запэўняю, што будзе цікава, — прапанаваў Аптыміст.

— Не хачу,—катэгарычна заявіў Песіміст. — Нічога цікавага не будзе.

— Не любіш цырка?

— Не люблю!

Аптыміст усміхнуўся.

— Ну, гэта ты даремна. Цырк— мастацтва прыгожых, моцных, спрытных.

— Вось, вось — спрытных... — ажывіўся Песіміст. — Круцьверць, як гэта ў іх называецца, сальта-мартале — і, калі ласка, апладзіруйце...

— А чым гэта блага?

— А тым... Калі акрабат навучыўся стаяць дагары нагамі, дык адзін раз на ўсё жыццё. Тое ж самае ў гімнастаў, скакуноў, жанглёраў. Наглядзеўся я на іх у свой час дастаткова.

Аптыміст не здаваўся.

— А чым ты растлумачыш гэта? — І ён паказаў на народ, які валам валіў у цырк.

Песіміст паціснуў плячыма.

— Няхай ідуць.

— І мы пойдзем. Вось білеты. Ды якія! Другі рад. Ну?!

Песіміст, пазяхаючы, пайшоў за сваім прыяцелем.

Маё месца было ў трэцім радзе за плячыма Аптыміста і Песіміста. Мне падумалася: а што, калі глядзець новую праграму вачыма такіх вось розных людзей?

...Цырк зззяе агнямі. Гучыць знаёмая мелодыя задушэўнай беларускай застольнай песні. З-пад купала спадаюць велізарныя палотнішчы з нацыянальным арнаментам, які апаясвае манеж. Выходзяць удзельнікі паказу ў яркай вопратцы. І арэна станавіцца падобнай на веснавы луг. На пастамент, быццам сама вясна-красна, падымаецца дзяўчына. У руках у яе хлеб-соль—традыцыйная адзнака гасціннасці нашага народа, сэрца якога заўсёды адкрыта для сапраўдных сяброў. Як музыка, льюцца словы прывітання. Яны вабяць сваёй шчырасцю.

Так ярка і ўрачыста пачынаецца праграма. Мае суседзі прынялі гэты пачатак хоць і блізка да сэрца, але па-рознаму. Аптыміст усміхаўся, гучна апладзіраваў, час ад часу лёгенька штурхаў свайго сябра ў бок.

— А што я табе казаў!

Выгляд Песіміста сведчыў аб тым, што ў яго пачынаўся нейкі «пералом». Ён стаў больш уважлівым, нават пляскаў у далоні. Праўда, больш з меркаванняў тактоўнасці. Але ўвага да падзей на манежы выкрывала Песіміста: ён захапіўся паказам.

За парад-пралогам пачаўся імклівы каскад нумароў. Яны вызначаліся творчай разнастайнасцю, высокім выканаўчым майстэрствам і арыгінальнасцю. Гэты каскад не з'явіўся часткай паказу, ён мімаволі выліўся з самога пачатку добра задуманай праграмы, заструменіў, стаў яе натуральным працягам. У бадзёрым тэмпе выконваўся нумар за нумарам. За акрабатамі выступалі музыканты, за музыкантамі — гімнасты, а за гімнастамі — жанглёры...

Я падумаў: «А можа, Песіміст, чаго добрага, зноў заные», бо на манежы выконваліся даўно знаёмыя стойка, сальта-мартале, капштэйны, баланс, жангліраванне мячамі, булавамі, кольцамі. Гімнасты практыкаваліся на трапецыях, а жакеі ездзілі на конях... Але Песіміст і не думае хмурыцца. Ён усміхаецца шчыра, добра.

Пад купалам цырка артысты Вязавы.

пляскае, не шкадуючы далоней. Урэшце не яго, а ён штурхае ў бок і не Аптыміста, а суседа, незнаёмага чалавека. Праняло, значыць...

Ён раптам звяртаецца ці то да мяне, ці то да ўсіх, што сядзяць навокал, і ўсхвалявана гаворыць:

— Усе яны нейкія іншыя... Разумееце? Як у жыцці...

«Як у жыцці...» — цікавая думка. І, здаецца, правільная. І сапраўды, якім уяўляўся нам работнік цырка ў недалёкім мінулым? Чалавекам выключнай, каб не сказаць, звышнатуральнай фізічнай сілы. Ды і сам ён прыкладаў нямала намаганняў да таго, каб паказацца іменна такім — таямнічым і недасягальным для простых людзей, якія сядзяць за бар'ерам манежа. А цяпер?

Я гляджу на віртуозных выканаўцаў праграмы «Бывайце здаровы» і ні адзін з іх мне не здаецца «звышчалавекам». Наадварот, здаецца, што яны і зусім не цыркачы-прафесіяналы, а так, проста цудоўныя хлопцы і дзяўчаты, якія сышлі з рыштаванняў нашых велізарных новабудоўляў, прыйшлі з пэхаў нашых заводаў-волатаў, прыехалі сюды з нашых шырокіх палёў, каб у сяброўскім турніры перад такімі, як яны самі, пазмагацца ў зграбнасці, сіле і спрыце. І калі тыя, што за бар'ерам, бурна рэагуюць на іх удачы, значыць—разумеюць душу мастацтва і заўтра гатовы ўдзельнічаць у спаборніцтве на такой жа арэне.

Мара? Не. Хто бывае на масавых спаборніцтвах па гімнастыцы, у прыватнасці, па мастацкай гімнастыцы, той, капэўна, скажа, што гэта адна з адзнак будучага чалавека, які гарманічна з'яднае ў сабе не толькі душэўнае багацце і маральную чысціню, але і фізічную дасканаласць. А гэтая дасканаласць уключае ў сабе харастро і пластыку чалавечага цела і дасягаецца, як вядома, не адной толькі ранішняй фізічнай зарадкай. Майстры цырка не толькі паказваюць сваё мастацтва, крычыцай якога па сутнасці з'яўляецца фізкультура і спорт, але і прапагандуюць яго карысна. Інакш кажучы, выклікаючы пачуццё бадзёрасці і радасці, яны разам з тым абуджаюць у людзей упэўненасць у магчымасць свайго фізічнага ўдасканалення.

Аднак вернемся да арэны. Пад купалам цырка — Данілава і Мар'янкоў. Здавалася б, што могуць рабіць артысты на двух вертыкальных канатах? Падняцца ўгару, спуціцца долу. Не, не толькі гэта! У руках спрытных гімнастаў простыя вяроўкі ператвараюцца ў сродак для здзіўляючага майстэрства. На страшэннай вышыні артысты, быццам бы гуляючы, як птушкі ў небе, выконваюць найцяжэйшыя практыкаванні паветранай гімнастыкі.

На манежы — музычная пяцёрка: Папоў, Кузін, Рэдзін, Новікаў, Мінкін. У іх простая труба, «абярнуўшыся» дзіцем і трапіўшы ў дзіцячую каляску, плача, гневаецца, патрабуе ўдзелу ў выступленні. І толькі пачуўшы салодкія гукі калыханкі, усхліпвае і сціхае.

Сілавыя акрабаты Сомаў і Горлаў адмовіліся ад традыцыі, якая доўгі час дзяліла партэрных акрабатаў на «верхніх» і «ніжніх». У нумары ў іх няма ні верхняга, ні ніжняга. Артысты, выконваючы трукі, па чарзе становяцца то тым, то другім. Таму і нумар глядзіцца з цікавасцю і лёгкасцю.

Арыгінальныя музычныя жанглёры Адліванікі, у якіх дзіўна іграе нават сталовы посуд. Вабяць сваім майстэрствам артысты Польдзі, Кеменава і Майсеенка. Яны спалучаюць віртуозную язду на манацыклах з не менш віртуозным жанглiраваннем. Цудоўныя Гертруда і Вячаслаў Дэмаш, якія дэманструюць вышэйшую школу верхавой язды.



Выступаюць жанглёры на манацыклах — артысткі Кеменава і Майсеенка.

Фота Ул. КРУКА.

Гледачы цёпла сустрэлі і сваіх старых знаёмых: выканаўцаў камічнага палёту Вязавых, акрабатаў-скакуноў Аляксеевых, сілавога жанглёра Неліповіча і іншых. Але трэба шчыра сказаць, што амаль усе яны не надта многа дадалі ў сваім майстэрстве да таго, што мелі раней.

Увесь вечар на манежы нястомна працуе дывановы клоун Калабок.

Аптыміст сказаў пра яго:

— Здольны, чорт, сіла, але, разумееш, не па той дарожцы ідзе. Яму час ужо самому сабе пракладваць шлях. А ён, бачыш, ходзіць па сцяжынцы, якая пратаптана ўжо іншымі.

Песіміст пагадзіўся.

Сябры сказалі шчырую праўду. Артыст Калабок малады і таленавіты. Ён пераймае, дэманструючы свае выключныя здольнасці, выканаўцаў усіх, без выключэння, нумароў. Але ж гэта, няхай з меншым майстэрствам, рабілі да яго і пяць, і пятнаццаць, і трынаццаць год назад іншыя. І таму хацелася б, каб Калабок знайшоў свайму шматграннаму таленту больш дастойнае выкарыстанне. Уласнае, арыгінальнае. Будзе шукаць — знойдзе. Павінен знайсці.

Заключае праграму «Бывайце здаровы» новы арыгінальны атракцыён «Усё, як у казцы». Яго аўтар і выканаўца ілюзіяніст Анатоль Шаг, які, дарэчы, з'яўляецца і мастацкім кіраўніком Беларускага калектыву, бадай, як ні хто іншы, разумее вострую неабходнасць смелых пошукаў у цыркавым мастацтве. Пошукаў, да якіх заклікае наша бурная рэчаіснасць, якая не церпіць застою.

Атракцыён Анатоля Шага з партнёрамі і асістэнтамі складаюць сцэны-карцінкі на надзённыя тэмы. У іх артысты-ілюзіяністы то ўслаўляюць магутнасць савецкага чалавека, творцы новага жыцця, то востра выкрываюць тое, што з'яўляецца перашкодай на яго шляху наперад, а то проста паказваюць вясёлыя, займальныя сітуацыі.

Есць у атракцыёне, напрыклад, сцэна-карцінка «Камбінат бытавога шчасця». Тут вам могуць афарбаваць валасы, але пасля гэтага яны зусім вылезуць. Тут могуць памяняць колер вашай піжаме, але вы застанецеся без піжамы. Тут за ўсё бяруцца, але нічога як след не робяць. Кіруе гэтым «прадпрыемствам» нейкае падабенства чалавека-карабка з «медным лобам». І калі абураныя заказчыкі разносяць яго літаральна па частках, аказваецца, што гэта і сапраўды не чалавек, а манекен з «арганчыкам».

Убачыўшы такое, Аптыміст і Песіміст шматзначна пераглянуліся і пачалі моцна пляскаць у далоні. Пазней Песіміст, не тоячы задавальнення, сказаў:

— Казка — хлусня, ды ў ёй намёк!..

І правільна сказаў: да справы, якая датычыць шчасця і дабрабыту савецкага чалавека, нельга блізка дапускаць прайдзісветаў, авантурыстаў, няўмек, у якіх замест галавы «арганчык», замест клопату аб людзях — прага асабістай нажывы.

Анатоль Шаг найлепшым спосабам выкарыстоўвае багатыя магчымасці ілюзіі. Ён імгненна «ператварае» арэну ў неабдымнае поле каласістай пшаніцы. Як у казцы? Не, як у жыцці. Гэта ж па сутнасці сцверджанне глыбокай думкі, што савецкім людзям па сіле самыя смелыя здзяйсненні, перад якімі бляднее найярчэйшая фантазія казак.

«Бывайце здаровы»... Дух гэтага добрага пажадання адчуваўся ў цырку з пачатку і да канца паказу. На выхадзе маю ўвагу зноў прыцягнулі Аптыміст і Песіміст. Пра першага можна і не гаварыць. Але вось другога нельга было пазнаць. Ён нават з натхненнем пра нешта размаўляў, жэстыкулюючы. У вачах з'явіўся бляск. Ён стаў нібы прыгажэйшы. Не, цяпер, гэты чалавек не забудзе дарогі ў цырк!

І, бадай, лепшай удзячнасці артыстам, чым гэта, і не патрэбна.

**Васіль ДАНІЛЕВІЧ.**

# ПАЭЗІЯ НОВАЙ ПОЛЬШЧЫ

Творы лепшых прадстаўнікоў польскай літаратуры, пачынаючы ад тых, якія стаялі ля вытокаў і канчаючы самымі маладымі, прозвішчы якіх пачалі з'яўляцца ў польскім друку ў апошнія пасляваенныя гады, перакладаліся і перакладаюцца на беларускую мову. У гэтым напрамку многае зроблена такімі нашымі вядомымі паэтамі і перакладчыкамі, як Янка Купала, М. Танк, П. Броўка, П. Пестрак, М. Машара, С. Дзяргай і інш.

Некалькі год назад у Мінску выйшла анталогія сучаснай польскай паэзіі ў перакладзе на беларускую мову.

Большасць сучасных польскіх паэтаў, з'яўляючыся носьбітамі высокай паэтычнай культуры і шыроких інтарэсаў, уласцівых польскай літаратуры наогул, у апошніх сваіх творах адгукаецца на разнастайныя з'явы мінулага і сучаснага. Асабліва пранікнена польскія паэты пішуць аб сваёй радзіме, аб яе новым ладзе і аб той гіганцкай рабоце партыі і ўрада, дзякуючы якой перабудоўваецца жыццё на новай, сацыялістычнай аснове, змяняюцца ўзаемаадносіны людзей, як і аблічча усей краіны.

Новае заўсёды нараджаецца ў барацьбе са старым, аджываючым свой век. Гэта барацьба не лёгкая, таму што старое абараняецца з дапамогай старых традыцый і закаранелых прывычак, таму што чалавек нясе ў сабе груз перажыткаў мінулага. Канфлікты паміж новым і старым хвалююць і сучасную маладую польскую паэтэсу Віславу Шымборскую:

Не мала значыць —выйсці з асяроддзя
Адной фармацыі і стаць другою,
Цяжэй знайсці сябе ў сваім народзе
І быць яму заўжды ва ўсім слугою.

Маладая польская паэзія разам са сваімі захапленнямі новымі «моднымі» формамі, новымі пошукамі — падчас памылковымі, — усё ж прыносіць у жыццё штосьці сваё, новае, важнае, цікавае. Складаныя шляхі да творчай сталасці. Але па меры росту знікае ўсё наносное, выпадковае і астаецца цудоўная, паўнакроўная праўда жыцця.

Друкуючы вершы вядомых сучасных польскіх паэтаў Ул. Бранеўскага і Я. Івашкевіча, мы аднячасова знаёмім сваіх чытачоў з творамі паэтычнай моладзі — С. Струмф-Вайткевіча, Г. Ясічка, М. Яструна.

□ □

Яраслаў ІВАШКЕВІЧ

## ХАЦЕЎ БЫ

Бывае—кладчык возьме цэглу
І раптам (здарыцца ж такое!)
Замілавана зіркам беглым
У воблачка над галавою
Загляне раз, і зноў загляне,
За ім—другі, і кладка стане...

Хацеў бы й я, каб з рыштаванняў
Той кладчык, наш чытач заўзяты,
Узрушана, з замілаваннем,
І з цэглай у руцэ прыўзнятай
Так слухаў верш мой, каб мой верш
Вёў мур з паверха на паверх.

Пераклад Я. СЕМЯЖОНА.

Уладзіслаў БРАНЕЎСКІ

## КРОПЛЯ КРЫВІ

Здабудзь ты кропельку крыві,
Калі пісаць захочаш вершы,
Няхай у горле хоць квіліць,
Пакуль не стане словам першым.

А стане—значыць, назаўжды,
Як мур, навокал земляў польскіх...
А Польшча—бор і гарады,
Трамвай на вуліцы, на Вольскай...

А Польшча—гэта жыць, тварыць
І працаваць мазольна зрання.
Хоць Польшча ўмее добра біць,
Ды міру ў цэлым свеце прагне.

Пераклад П. ПЕСТРАКА.

## ЯК ПРЫЙДЗЕ ГАДЗІНА СМЕРЦІ

Як прыйдзе гадзіна смерці,—
А трэба ж калі паміраць, —
Патраплю я сам памерці,
Не будзь ты пры мне і не радзь.

Хачу я памерці паўжартам:
З высока ўзнятым чапом,
Каб вочы глядзелі ўпарта,
Каб зброю трымала далонь.

Каб вецер мяне не плачам,
А голасам пчол вітаў,
Каб Віслу я, Татры ўбачыў,
Пра ўсё, што любіў, спяваў.

Мне хопіць малой пашаны,
Кароткі хай будзе плач.
Сябры хай накінуць раннем
На труп мой салдацкі плашч.

У дол хай апусцяць скромна
Там, дзе паду ў баю,
Салдацтва маё успомняць
І вольную песню маю.

Пасля хай ідуць на поле
Праліць за айчыну кроў.
Вось гэта ёсць мая воля,
Я гэтак жыццё прайшоў.

Пераклад С. ДЗЯРГАЯ.

Станіслаў СТРУМФ-ВАЙТКЕВІЧ

## БАЛАДА АБ САЛДАЦКАЙ КОНАЎЦЫ

Звычайна і проста
аб простай прыладзе
расказана будзе
у гэтай баладзе —
аб конаўцы,
вечным рыштунку салдацкім,
нядаўні салдат
вам раскажа па-брацку.
Не мала з яе
мы глынялі, бывала,
а ўсё шкадавалі,
што мала...

У верасні
ў нейкім сяле пры гасцінцы
забылі яе
ля вядра пехацінцы...
Яе медсястра
прыхапіла з сабою,
і потым,
выносячы раненых з бою,
паіла з той конаўкі
млосных ад смагі
вадой жыватворнай
з паходнае флягі.
На ёй быў малюнак —
чатыры наготкі,
а ў ёй—не вада,
а кляновік салодкі.
Дап'е з яе ранены
лекі жывыя
і ўбачыць на донцы
браткі палявыя,
І ўспомніцца раптам
бацькоўская хата;
ён сцішыцца ў сне —
не будзіце салдата...

А конаўка — следам
ішла за вайною,
паіла салдат
у снягах пад Масквою,
з акопа ў акоп,
ад лафета к лафету
яе пераносілі,
як эстафету.
Сто сутак над Волгай,
дзе фронт лёг падковай,
яна вандравала
па роце стралковай,—
салдацкая брацціна,
сябра паходны,—
як срэбны бакал
пераходны...

Малюнак абцёрся,
наготкі завялі,
І толькі браткі
ўсё цвілі на эмалі.
Яе шанавала
сторотая рота,
заўсёды глынуць з яе
брала ахвота,
калі ж не было ў ёй
на дне ні расінкі,—
хто-небудзь дапье,
І, глынаючы слінкі,
абкуліць і пусціць,
як шапку па кругу,
салдацкую конаўку —
шчырага друга.

Паўсвета яна
абхадзіла ў паходзе,—
а колькі ж салдат
пабратала ў пяхоце! —
І тых, хто дзівіўся
браткам на эмалі,
І тых, каму пісем
з-за фронту не слалі,
І тых, каго з Волгі,
з раўнін Прыдняпроўя
на Віслу вёў шлях,
абазначаны
кроўю...

Заўжды ў пераходах,
услед за вайною,
была яна нам
І ракой, І чайною —
засмяглым ад спёкі,
глухім ад знямогі.
На захад вялі нас
дарогі...
Нарэшце ў Берліне
ёй выпала шчасце:
сышліся на стыку
дзве братнія часці,
І рускі танкіст —
сібірака плячысты —
напоўніў яе
І сказаў урачыста:
— Пі, брат мой паляк,
гэты кубак віна
за нашу пабеду
да дна!
За доблесць двух армій —
тваёй і савецкай, —
за нашу сустрэчу
ў сталіцы
нямецкай!

І конаўка ў момант
пайшла ўкругавую:
— За мужнасць І славу
славян баявую,
за мір на зямлі,
за салдацкую службу,
за шчасце народаў,—
за дружбу!

Пілі з яе ўсе
ў той армейскай арцелі,
у дно цалавалі
І болей хацелі,
бо кожны, хто выпе
І ў донца зірне,
заўважыць:
браткі встаюцца
на дне!

На тым бы і скончыць
мне трэба, здаецца,
баладу салдацкага,
шчырага сэрца
аб конаўцы,
просценькай рэчы ваеннай,
не з золата, срэбра, —
а ўсё ж неацэнкай.
Яе на паўсвеце
дзялілі па-брацку
І ў Польшчу прынеслі
у ранцы салдацкім.

Пераклад Я. СЕМЯЖОНА.

Генрык ЯСІЧАК

Ты куды, вадзіца,
У свет плывеш вялікі,
Гучная, як песня
З-пад смыка музыкі!

Ты каго шукаеш
Каго деганяеш
Ты каму пра радасць
Ці пра сум спяваеш

Ой, вада-вадзіца,
Шумная, крутая!
Помніш ты, калі я
Была маладая!

## Пявучая вада

Ці ты ўжо забыла,
Як я тут гуляла,
Кожны вечар хлопца
Мілага чакала!

Да люстранай тоні
Я глядзець хадзіла —
Ці яна маю ўсю
Прыгажосць адбіла!

Ці ты не забыла,
Як мне рваў ён мяту,
Цалаваў І песціў
Мае нажаняты!

Ой, вада-вадзіца!
Калі ж ты вясною
Мілага забрала
Ды з маёй красою.

Калі ты забрала
Маладыя годы, —
Забяры І слёзы
Мае назаўсёды.

Пераклад М. ТАНКА.

Мечыслаў ЯСТРУН

## ЯБЛЫКІ

Два яблыкі ў мяне ў руках —
Бурштын ранета,
І на далонях—нежны пах
Садоў І лета.

Жар жніўня, верасня зара
У іх іскрацца.
...А я дзеля каго згараў
У творчай працы!

Падбег сынок—мая любоў —
Схапіў іх з ходу
І ўпіўся часнаком зубоў
У сладыч плоду.

Пераклад Я. СЕМЯЖОНА.

# ПЕРАПІСКА ПАБРАЦІМАЎ

*По старонках часопіса „Полымя“*

У верасневым нумары часопіса «Полымя» змешчаны цікавы артыкул Генадзя Кісялёва «Францішак Багушэвіч і Ян Карловіч», напісаны на аснове лістоў выдатнага беларускага паэта-дэмакрата па вядомага польскага лінгвіста, этнографа і фалькларыста.

Г. Кісялёў, які нядаўна парадаваў нашага чытача новымі матэрыяламі пра рэвалюцыйную дзейнасць слаўных сыноў беларускага народа К. Каліноўскага і А. Трусава, жыццё і творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча, выявіў у фондах Цэнтральнага гістарычнага архіва Літоўскай ССР каштоўны скарб — лісты аўтара «Дудкі беларускай» да Я. Карловіча. Знойдзена 51 пісьмо, 9 паштовак, адна тэлеграма; датуюцца яны рознымі гадамі: адзін ліст напісаны Ф. Багушэвічам яшчэ ў 1865 г., астатнія ў 1887—1896 гг.

Беларускае літаратуразнаўства ўжо мела пэўныя звесткі пра шчырую дружбу беларускага паэта з польскім вучоным (пісьмы Э. Ажашка да Я. Карловіча, успаміны М. Федароўскага і інш.), але знойдзеныя матэрыялы, як слушна адзначае Г. Кісялёў, даюць магчымасць па-новаму, больш поўна высветліць абставіны шматгадовых сяброўскіх сувязей Ф. Багушэвіча і Я. Карловіча.

З перапіскі высвятляецца, што яшчэ ў 60-гады паміж Ф. Багушэвічам і Я. Карловічам усталяваліся прыяцельскія адносіны. Аўтар артыкула выказвае слушнае меркаванне, што ўпершыню яны сустрэліся і пазнаёміліся ў той час, калі Ф. Багушэвіч працаваў настаўнікам у вёсцы Доцішкі (цяпер Радунскі раён), а Я. Карловіч жыў непадалёку ад гэтых мясцін—у маёнтку Падзітва. Больш таго, самы ранні ліст Ф. Багушэвіча, які датаваны 26 жніўня 1865 г., пралівае святло на некаторыя абставіны драматычнай старонкі біяграфіі беларускага паэта і тлумачыць, якім чынам яму, удзельніку паўстання 1863 г., удалося пазбегнуць рэпрэсій царскіх улад. Як нядаўна стала вядома, Ф. Багушэвіч у часе паўстання ўдзельнічаў у баях пад Сувалкамі, у Аўгустоўскіх лясах, дзе яго ніхто не ведаў. Калі ж зажыла рана, атрыманая ў часе сутычкі з царскімі войскамі, вярнуўся ў Вільню. Заставацца ў губернскім горадзе і мазоліць вочы ўладам было небяспечна: хоць царскія шпікі яшчэ не здолелі сабраць дастаткова кампраметуючага матэрыялу супраць доцішскага настаўніка, але яны ведалі пра ўдзел у паўстанні яго бацькі і братоў, і ў гэты крытычны і цяжкі момант прыйшоў на дапамогу свайму сябру Ян Карловіч. Вось што пісаў з далёкага Нежына 26 жніўня 1865 г. Ф. Багушэвіч у лісце, які быў адрасаваны ў маёнтак Падзітва маці Яна Карловіча: «Мабыць, яснавяльможнай пані вядома, што я абавязаны яе высакароднаму сыну ўсёй сваёй будучыняй: можа і да гэтага часу я абіваў бы віленскі брук без усякай карысці, калі б не яго высакародная дапамога, якую ён мне аказаў, даючы грошы на дарогу да Нежына...»

На жаль, перапіска Ф. Багушэвіча з Я. Карловічам захавалася не поўнасцю, і нам невядома, як развівалася іх дружба, калі беларускі паэт доўгі час працаваў судовым следчым на Украіне. Аднак ёсць усе падставы меркаваць, што за гады перыяд іхняе сяброўства паглыбілася, бо, як правільна заўважае Г. Кісялёў, «першыя пісьмы за 1887 г. адразу ўводзяць нас у атмасферу ўжо ўсталяваных адносін».

Лісты Ф. Багушэвіча, напісаныя польскаму вучонаму і яго жонцы ў 1887—1889 гг., сведчаць, што беларускі паэт пасля пераезду з Украіны ў Вільню стаў давераным блізкім і сваім чалавекам у сям'і Карловіча. З гэтых лістоў відаць, што Я. Карловіч—выдатны знаўца славянскіх моў і фальклору — не толькі прыхільна ставіўся да паэтычнай творчасці свайго сябра, дапамагаў яму выдаваць кнігі за мяжою, але, лічачы яго крышталёва сумленным чалавекам, даручаў яму нават весці гаспадарку і фінансавыя справы маёнтка Вішнева. Сярод прыватных звестак пра гаспадаранне пасобных арандатараў у Вішневе, фінансавых справаздач пра становішча спраў на броварах і з продажам лесу трапляюць тут цікавыя і трапныя назіранні пра жыццё арандатараў і становішча сельскай гаспадаркі ўвогуле «Што стан земляробства і вінакурства жахлівы — сумнявацца не даводзіцца! Але і гаспадаранне таксама жахлівае», — пісаў Ф. Багушэвіч у пісьме ад 5(17) лютага 1889 г. Ёсць у гэтых лістах і такія словы, якія мог напісаць беларускі паэт толькі самаму блізкаму і сардэчнаму прыяцелю.

Лісты Ф. Багушэвіча да Я. Карловіча — гэта не проста і не толькі прыватная перапіска аўтара «Дудкі беларускай». Зместам, тэматыкай і пытаннямі, якія ўздымаюцца ў пісьмах, знойдзеныя матэрыялы даюць беларускаму літаратуразнаўству багатыя і вельмі цікавыя факты пра жыццё, творчасць і светапогляд выдатнейшага прадстаўніка айчыннай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя. Да самага апошняга часу мы мелі скупыя, вельмі агульныя і не зусім дакладныя біяграфічныя звесткі пра яго. Не будзе перабольшаннем, калі я скажу, што да гэтага часу мы з большага ведалі Ф. Багушэвіча — паэта і вельмі мала ведалі Ф. Багушэвіча — чалавека, яго характар, умовы жыцця, матэрыяльнае становішча. Некаторыя звесткі пра жыццё і характар беларускага песняра давалі ўспаміны польскага літаратара Н. Роўбы, некралогі, якія з'явіліся ў рускім і польскім перыядычным друку, лісты аўтара «Дудкі» да Э. Ажашка, урыўкі з якіх нядаўна былі апублікаваны на старонках беларускай «Нівы», але толькі з пісем да Я. Карловіча даволі поўна і выразна вырысоўваецца аблічча паэта-дэмакрата Францішка Багушэвіча як чалавека-гуманіста, перадавога грамадскага дзеяча і нават вучонага.

Чялёгкай была жыццёвая доля беларускага паэта. Бясконцыя вандраванні па Украіне ў сувязі з перамяшчэннем па службе (Ф. Багушэвіч па нейкай загадкавай прычыне трапіў нават у Валагодскую губерню), пераезд у 1884 г. у Вільню, дзе па сутнасці трэба было пачынаць жыццё спачатку, — усё гэта не дазволіла яму жыць хаця б у адносным матэрыяльным дастатку. Як раней, так і ў Вільні Ф. Багушэвіч, абараняючы інтарэсы простага чалавека, не ішоў на здзелкі з багацеямі, асноўнымі кліентамі яго заставаліся сяляне, рамеснікі, гарадская беднота, якія часам не маглі нічым заплаціць адвакату, апрача сардэчнага слова падзякі. Таму так часта беларускі паэт быў вымушаны звяртацца да Я. Карловіча з просьбай пазычыць грошай і яшчэ часцей прасіць прабачэння, што не можа своечасова вярнуць пазычаную суму: «На сёння знаходжуся ў ганебным становішчы, бо не разлічваюся за пазычанае ў патрабны час: сёння магу адаслаць толькі 100 руб., маю надзею хутка прыбыць у Варшаву з рэштай доўгу» (ліст ад 30 снежня 1891 г.). Такія мясціны часта сустракаюцца ў пісьмах аўтара «Дудкі».

Няма нічога дзіўнага, што Ф. Багушэвіч, які па складу характару быў вялікім аптымістам, часам усклікаў: «Божа, дай вытрымку і надалей! Але какіруй ало на сухія ласы! Можа ніхто з такой дурной мінай не глядзіць на гэтыя прайшоўшыя гады, як я...»

Але найчасцей Ф. Багушэвіч выказваў свае нараканні праз дасціпны жарт ці ў здзеклива сатырычнай форме: «Меў намер адправіць сваю араву ў гэтым годзе ў вёску на лета, — тым часам у майго пасасара разгасціўся ў доме тыфус (апроч сухот у кішэні)!» — паведамляў паэт жонцы Я. Карловіча 13(25) чэрвеня 1889 г. А вось як апісваў Ф. Багушэвіч Віленскую паказную выстаўку: «Музыка грыміць «Камарынскага», што аж коні скачуць! Забыў пра бараноў з рагамі, а вельмі многа афіцэраў наведваюць іх; а калі б не нейкі пан, які тут з бізуном падтрымлівае конскі парадак, — не бедаю, што б гэта было, таму што піва вельмі добрае, а называецца «пільзенскае». Сыры так смардзяць, што паны не могуць вытрымаць і ядуць; а капуста ў самых вялікіх галовах, кветкі фальшывыя (штучныя) такія прыгожыя, што ніхто ніколі падобных у прыродзе не бачыў, і вельмі, вельмі многа розных штучных (фальшывых) рэчаў і розных выдрадкаў з мясцовых абывацеляў больш за ўсё. Адным словам, дзівосная, захапляючая выстаўка!» (пісьмо ад 7(19) верасня 1891 г.).

Крытычна ацэньвае Ф. Багушэвіч судовыя парадкі («Цяпер дзіва «Міласць і праўда хай пануюць у судах» — анамалія»...), тагачаснае віленскае жыццё («У Вільні ціха, як у калодзежы...» «Апроч інфлуэнцы, у Вільні нічога няма, хіба крыху дарагоўлі»), палітыку царскіх улад у нацыянальным пытанні. Знішчальную характарыстыку дае ён буржуазнаму банку: «[Пытанне], Што такое банк? А[дказ]. Гэта рэзервуар, які сцягвае ад грамадства яго збяражэнні, каб узбагаціць імі поўнага банкіра або таго, хто яго абкрадзе...» (пісьмо ад 18 сакавіка 1893 г.).

Яркі малюнак сялянскай галечы паўстае з ліста, напісанага паэтам 21 снежня 1894 г. (2 студзеня 1895 г.): «Сельскагаспадарчы крызіс моцна дае сябе знаць: сяляне маюць кашу і блінцы са скваркамі, але манеты — ні на ёту! Ходзячы па гораду, аблізваюцца, глядзяць у вітрыны магазінаў, але нічога не купляюць, самі моляцца ў касцёлах, а на абедню айцам насцёла — фігу; стогнуць, чыкільгаюць, паміраюць без дактароў, робяць усемагчымыя падлогі без удзелу адвакатаў: курдуты латаюць жонкі, боты самі вечарком зашываюць дратваю... словам, нікому ні капейчыны! Цудоўныя часы!»

Паэт-дэмакрат піша пра цяжкае жыццё працоўнага беларускага і літоўскага сялянства, страшэнную дарагоўлю, беззямелле, частыя недароды, вялікія маразы, якія шкодзілі гаспадарцы. Аднак ён аптымістычна глядзеў у будучыню і верыў у вялікія сацыяльныя перамены: «Ніхто, аднак, не думае, што так можа застацца... Так быць не можа, павінна быць інакш, і інакш быць не можа — толькі лепш!» (7(19) студзеня 1888 г.).

Значнае месца ў лістах Ф. Багушэвіча адведзена творчым пытанням. У адным пісьме да Я. Карловіча (9(21) лістапада 1890 г.) ёсць такія вельмі цікавыя радкі: «Сардэчна дзякую шаноўнаму пану за абяцанне надрукаваць рукапіс, які быў высланы ў адрас пана праз кніжны магазін Арцта поштай, у форме заказной пасылкі»... Г. Кісялёў робіць зусім верагоднае меркаванне, што гутарка тут ідзе пра зборнік «Дудка беларуская».

Да гэтага часу мы нічога не ведалі, калі былі напісаны паэтычныя творы, якія склалі зборнікі «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». Знойдзеныя лісты даюць часткова адказ на гэта пытанне, уводзяць у творчую лабараторыю паэта.

На аснове тэкстаў вершаў, прыкладзеных да пасобных пісем, можна ўстанавіць, што «Думка» напісана не пазней 23 мая 1887 г., байка «Воўк і авечка» не пазней 10(22) чэрвеня 1886 ці 1887 г., «Хцівец і скарб на святога Яна» не пазней 16(28) лістапада 1887 г., «У судзе» не пазней 30 снежня 1889 (11 студзеня 1890 г.), верш «Ахвяра» не пазней 2(14) снежня 1891 г. У лісце, напісаным Я. Карловічу 23 лютага (6 сакавіка) 1891, Ф. Багушэвіч паведамляў, як ідзе праца над творамі, што пасля ўвайшлі ў зборнік «Смык беларускі»: «Песні ідуць уперад няблага, а побач нараджаюцца і другія рэчы». Цікава і тое, што паэт тлумачыць гісторыю напісання вершаў «Хцівец і скарб на святога Яна», указвае іх фальклорныя вытокі.

Лісты Ф. Багушэвіча пацвярджаюць і той факт, што беларускі паэт быў супрацоўнікам польскага часопіса «Край», які выдаваўся ў Пецярбургу: «Быў тут супрацоўнік «Краю»... папракаў мяне за вяласць і абыякавасць у адносінах пасылкі карэспандэнцый»... (15(27) лістапада 1888 г.).

Мне ўжо даводзілася пісаць пра гэта і разглядаць публіцыстычныя творы беларускага паэта, якія публікаваліся ў часопісе «Край» («Новае пра Ф. Багушэвіча», «Полымя», № 6, 1960). Цяпер, пазнаёміўшыся з урыўкамі пісем Ф. Багушэвіча да Я. Карловіча, я магу катэгарычна сцвярджаць, што шматлікія артыкулы, падпісаныя псеўданімамі «B. Huszica», «Hiusiz», «Vester» належыць пяру аўтара «Дудкі беларускай». Памеры гэтага артыкула не дазваляюць спыніцца на тэматычна аднолькавых і нават тэкстуальна блізкіх мясцінах у пісьмах Ф. Багушэвіча і яго артыкулах, але я думаю вярнуцца яшчэ да гэтага пытання.

Артыкул «Францішак Багушэвіч і Ян Карловіч» атрымаўся надзвычай змястоўным не толькі таму, што ў руках даследчыка быў цікавы матэрыял. У асобе Генадзя Кісялёва беларускае літаратуразнаўства мае ўдумлівага і працавітага гісторыка-архіваліста і адначасова сапраўднага літаратара, які добра валодае пяром.

Часопіс «Полымя» зрабіў добрую справу, пазнаёміўшы чытача з пісьмамі Ф. Багушэвіча, якія пашыраюць і паглыбляюць звесткі пра жыццё і творчасць выдатнага сына беларускага народа